ЗЬВЯЗДА

№ 125 (3233) Серада, 5-га Чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

Некалькі соцень студэнтаў разграмілі рэдакцыю яўрэйскай газэты „Хвіля". Разграмілі таксама яўрэйскую гімназію, разграбілі яўрэйскі студэнцкі дом. Яўрэяў, што праходзілі, зьбівалі. Многа параненых

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.) Пасьля пяцімесячнага перапынку пушчаны ў ход Брылеўскі цагельны завод, які сёлета выпусьціць 9 мільёнаў цэглы

Васеньняя пасеўная кампанія

Наступная васеньняя пасеўная кампанія павінна праходзіць пад лёзунгам перш за ўсё поўнага скарыстаньня вытворчых магчымасьцяй самога сельскага насельніцтва, а потым ужо сродкаў дзяржавы і мясцовага бюджэту. Цэнтральнымі задачамі застаюцца: 1) пашырэньне пасеўных плошчаў; 2) узьняцьце ўраджайнасьці; 3) узмацненьне і пашырэньне сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі.

Аднак, практыка вырашэньня гэтых задач паўстае перад намі цяпер у іншым разрэзе, чым у веснавую пасеўную кампанію. У спажываючай паласе і ў цэнтральна-чарназёмнай вобласьці, дзе задача інтэнсіфікацыі сельскае гаспадаркі зьвязана з пераходам да шматпольных севазваротаў, лёзунг пашырэньня азімага кліну можа мець прагрэсыўнае значэньне толькі пастолькі, наколькі ў севазварот уцягваюцца новыя землі. **Агульнае пашырэньне пасеўнае плошчы азімых па пляну намячаецца ў 6 проц.** Асабліва шпаркае пашырэньне пасеўнае плошчы намячаецца па сацыялістычным сэктару. У адносінах другой задачы—узьняцьця ўраджайнасьці—у азімую кампанію мы павінны дабіцца масавага ўжываньня раду мерапрыемстваў: замены простага насеннага матар'ялу чыстым і гатунковым, адборкі насеньня, пратручваньня, радковага пасеву, распаўсюджаньня культурных папараў, зяблявае пахаці, угнаеньня ўсіх відаў, барацьбы са шкодні-камі. Намечаныя мерапрыемствы ўвогуле даюць магчымасьць разьлічваць **на ўзьняцьце ўраджайнасьці ад 5 да 7 проц.**

Трэцяй задачай зьяўляецца пашырэньне і ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі. У справе калгаснага будаўніцтва ў васеньні нарыад, мы з асаблівай увагай павінны аднесьціся да ўзмацненьня і ўзбудненьня існуючых калгасаў. Адным з буйнейшых недахопаў сучаснага калгаснага будаўніцтва зьяўляецца тое, што калгасы нашы вельмі дробныя. Сярэдні пасеў у калгасе складае каля 50 гэктараў. Другім важнейшым недахопам калгаснага руху зьяўляецца слабая аграмаджанасьць пасеваў і асабліва сродкаў вытворчасьці. Зьнішчэньне гэтых двух буйнейшых недахопаў таксама павінна ўвайсьці ў задачы васеньняй пасеўнай кампаніі.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на далейшае разгортваньне будаўніцтва саўгасаў. Паміж зьняцьцем ураджаю і пасевам азімых застаецца шмат часу, на працягу якога трэба разгарнуць кампанію па ачыстцы збожжа і пратручваньні насеньня. Адгэтуль задача—зараз-жа запяцца упарадкаваньнем зернаачышчальных машын, вызначыць каляндарныя тэрміны для кожнага зямельнага таварыства і г. д. Неабходна зараз-жа прыступіць да заключэньня кантрактацыйных умоў, скарыстоўваючы для гэтага накіроўваемыя ў вёску вытворчыя крэдыты, авансы для ўзьняцьця папараў і мясцовыя сродкі.

Адным з важнейшых фактараў правядзеньня васеньняй пасеўнай кампаніі павінна быць сацыялістычнае спаборніцтва. Вёска амаль яшчэ ня ўцягнута ў спаборніцтва. У васеньняй пасеўнай кампаніі ў гэтай справе трэба зрабіць значны крок наперад. («Правда»).

****

З фронту сацыялістычнага спаборніцтва

ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА ІНЖЫНЭРНА - ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ МАСКВЫ І УКРАІНЫ

ХАРКАЎ, 3. Учора ў Харкаў прыбыла дэлегацыя інжынэрна-тэхнічных работнікаў Масквы ў колькасьці 43 чал. У дэлегацыю ўваходзяць пераважна інжынэры-гарнякі, мэталісты, тэкстыльшчыкі і гарбары.

Сход маскоўскіх і украінскіх спэцыялістых прыняў рэзалюцыю, у якой заклікае ўсіх спэцыялістых Украіны і Масквы прыняць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве. Гэтымі днямі адбудзецца падпісаньне рэвалюцыйнага дагавору на сацыялістычнае спаборніцтва, пасьля чаго інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі Масквы паведаюць рад прамысловых раёнаў Украіны.

АДКАЗ КІЕЎСКІХ РАБОЧЫХ НА БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІ ПАКЛЁП

КІЕЎ, 3. Рабочыя кіеўскай трыкатажнай фабрыкі імя Р. Люксэмбург, сабраўшыся ў ліку 600 чалавек на мітынг і даведаўшыся пра паклёп, які распаўсюджваюць белаэмігранты аб сацыялістычным спаборніцтве, што праводзіцца ў СССР, прынялі рэзалюцыю, у якой выказваюць глыбокае абурэньне супроць гэтага паклёпу. Рабочыя заяўляюць, што яшчэ ніколі яны не перажывалі такога вялікага энтузіязму ў сваёй штодзённай рабоце, як зараз. У выніку спаборніцтва, штомесячная выпрацоўка рабочых фабрыкі павялічылася на 30 проц., штодзённая выпрацоўка на 40 проц. Колькасьць прагулаў, у параўнаньні з мінулым годам, зьменшылася ў 4 разы.

4.700.000 РУБЛЁЎ ЭКАНОМІІ

САРАТАЎ. 4. У выніку спаборніцтва Ніжня-Волскага прамстрою з Ленінградстроем на зьніжэньне сабекошту будаўніцтва, Ніжвопрамстрой зьнізіў кошт прамысловага будаўніцтва ў параўнаньні з мінулым годам на 11 проц., грамадзянскага — на 7 проц. Наогул-жа гэта дае эканоміі на 4 мільёны, 700 тысяч рублёў.

УРАД БАЛЬДВІНА ПАДАЎ У АДСТАЎКУ

Стварэньне новага ўраду будзе даручана Макдональду

ЛІБЭРАЛЫ ТРАЦЯЦЬ СВОЙ ПРЭСТЫЖ.—МАКДАНАЛЬД МАЕ НАМЕР СТВАРЫЦЬ УРАД БЯЗ УДЗЕЛУ ЛІБЭРАЛАЎ.—ТОМАС—КАНДЫДАТ У БУДУЧЫЯ МІНІСТРЫ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ. НЕПАКОЙ У ПОЛЬСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ КОЛАХ

Адстаўка ўраду

ЛЁНДАН, 3. У панядзелак адбылося пасяджэньне ангельскага габінэту. Пасьля абмену думкамі аб становішчы ў сувязі з вынікамі выбараў у парлямант, урад Бальдвіна парашыў падаць у адстаўку.

Вырашэньню Бальдвіна падаць у адстаўку папярэджвалі сур'ёзныя разгаласьсі ў кансэрватыўнай партыі. Частка кансэрватараў настойвала на тым, што ўрад павінен прыняць адзінае ганаровае вырашэньне, г. зн. неадкладна ачысьціць дарогу Макданальду. Іншыя, аднак, ускладалі надзеі на магчымасьць рэканструкцыі ўраду Бальдвіна з больш прагрэсыўнай праграмай, якая забясьпечыла-б ураду падтрыманьне лібэралаў.

Пасьля вырашэньня ўраду, Бальдвін зьявіўся ў Віндзорскі палац і заявіў каралю аб выхадзе габінэту ў адстаўку. Адстаўка прынята.

Макданальд—пераемнік Бальдвіна

Варшаўская газэта «Гайнт» паведамляе:

«Як перадаюць з Лёндану, ангельскі кароль парашыў даручыць стварэньне новага ўраду рабочай партыі на чале з Макданальдам, бо рабочая партыя атрымала больш чым іншыя партыі, мандатаў на выбарах у парлямант».

Ініцыятыва перайшла к рабочай партыі

ЛЁНДАН, 3. Як відаць з розных намёкаў лібэральнага друку і вестак, што атрымліваюцца в колаў больш блізкіх да лібэральнае партыі, лібэралы яшчэ да таго, як Бальдвін наважыў падаць у адстаўку, яўна хацелі гэтага. Ім хацелася, каб гэтым Бальдвін пазбавіў іх ад няпрыемнага становішча, у якім яны апынуліся-б у выпадку, калі-б кансэрватыўны ўрад выступіў у новай палаце са сваёй праграмай.

У пэрыяд выбарчае кампаніі, лідэры лібэральнае партыі катэгарычна заяўлялі, што яны ў другі раз ня зробяць сваёй памылкі 1924 году, г. зн. не дазволяць рабочай партыі ўзяць у свае рукі ўрадавую ўладу бяз усякіх папярэдніх умоў. Аднак, цяжка вразумець, якім чынам лібэралы змогуць унікнуць гэтага пры існуючых акалічнасьцях. Ім пагражае страта прэстыжу пры ўсякай пазіцыі, якую яны зойміць у новай палаце. Нельга сабе ўявіць, каб Лёйд-Джордж мог адважыцца на падтрыманьне Бальдвіна ў новай палаце без таго, каб канчаткова паставіць крыж на лібэральнай партыі. З другога боку, калі-б лібэралы галасавалі ва Макданальда, або проста ўстрымаліся ад галасаваньня, кансэрватары папракалі-б іх у тым, што іменна на лібэралах ляжыць галоўная адказнасьць за прыход рабочае партыі да ўлады.

Лёйд-Джордж выступаў перад выбаршчыкамі з усякага роду пырокавышчальнымі абяцаньнямі, бо ён ні на хвіліну не дапушчаў, што ў яго будзе ў новай палаце выстарчальная колькасьць мандатаў і што, таму яму прыдзецца выконваць свае абяцаньні. Усё-ж лібэралы разьлічвалі на значна большы посьпех і, ва ўсякім выпадку, разьлічвалі мець у палаце вобшчын выстарчальную вагу для таго, каб дыктаваць галоўным канкуруючым партыям свае ўмовы падтрыманьня. **Гэта стратэгія праваліласяі цяпер лібэралы апынуліся ў становішчы,** пры якім буржуазная грамадзкасьць мае поўную магчымасьць іх абвінавачваць у тым, што яны сваім «блэфам» прывялі да ўлады Макданальда. Тая акалічнасьць, што лібэралы добра ведаюць, наколькі моцная пазыцыя, у якую яны самі паставілі Макданальда, пацьвярджаецца шматлікімі заявамі лібэральнага друку. «Манчэстэр Гардыян» піша:

«Калі народу даводзіцца прымаць удзел у бегу на трох нагах, дык пажадана, прынамсі, каб яго ногі былі параўнаўча моцнымі і шпаркімі».

5-га чэрвеня адбудзецца наседжаньне парляманцкае фракцыі рабочае партыі, на якім будзе абгаварвацца сучаснае становішча. Аднак, агульны пункт гледжаньня дэпутатаў рабочае партыі высьвятляецца ўжо з розных заяваў партыйных лідэраў. У гутарцы з карэспандэнтам газэты «Дэйлі Гэральд», якая адбылася яшчэ да вырашэньня кансэрватараў падаць у адстаўку, Макданальд заявіў: «Рабочая партыя ўзяла ў свае рукі ініцыятыву і будзе трымаць яе».

Споўдзен сказаў, што рабочая партыя можа распрацаваць урадавую праграму неадкладных мерапрыемстваў, якую лібэралы будуць прымушаны падтрымліваць.

Абедзьве гэтыя заявы характэрны з таго пункту гледжаньня, што рабочая партыя лічыць сябе досыць моцнай, каб супрацьўляцца ўсякага роду спробам лібэралаў дыктаваць ёй умовы. Тыя лідэры рабочае партыі, якія раней выказваліся за дзелавую згоду з лібэраламі, як відаць, пераконваюцца, што становішча Макданальда досыць спрыяючае, каб весьці справы самастойна, зразумела, пры ўмове асьцярожнасьці.

Карэспандэнт ТАСС меў гутарку ў суботу і нядзелю з некаторымі дэпутатамі рабочае партыі, прычым, выявілася, што наогул дэпутаты схіляюцца да таго, каб Макданальд стварыў новы ўрад самастойна, сканцэнтраваўшы сваю ўвагу на галоўных праблемах (беспрацоўе, кватэрнае пытаньне, замежная палітыка), і гэтым прымусіў лібэралаў падтрымліваць урад рабочай партыі без папярэдняе згоды. **Пры гэтым, падкрэсьлівалася, што ў галіне замежнае палітыкі ўрад рабочае партыі зараз-жа зможа прыступіць да выпраўленьня тэй страты, якая была нанесена Англіі кансэрватарамі за апошнія 5 год, у прыватнасьці—аднавіць адносіны з Савецкім урадам і палепшыць адносіны з Амэрыкай.** Дэпутаты зазначалі, што гэтага роду мерапрыемствы ўзьнімуць прэстыж рабочае партыі і дапамогуць пераскочыць тую бездань, якая няўхільна выкрыецца ў палаце вобшчын, пасьля чаго можна будзе прыступіць да вырашэньня пытаньняў унутраное палітыкі.

Друк з вялікай зацікаўленасьцю абгаварвае магчымы склад новага ўраду рабочае партыі. Найбольшая ўвага зварачаецца на пытаньне аб тым, хто будзе міністрам замежных спраў. **У ліку кандыдатаў найбольш упарта называюць імёны Томаса і Мэзлі.**

****

ПАНЫ РАСЧАРВАНЫ

ВАРШАВА, 3. У польскіх палітычных колах, якія цікавяцца пытаньнямі замежнае палітыкі, выпікі ангельскіх выбараў выклікалі непакоі. У аўтарытэтных польскіх колах упэўнена спадзяваліся на перамогу кансэрватараў. Расчараваньне в поваду вынікаў ангельскіх выбараў яскрава праявілася ў артыкуле «Кур'ера Пораннага», які прыпісвае паражэньне кансэрватараў іх «добрадушнасьці», а галоўным чынам—галасам маладых жанчын, якія, паводле слоў газэты, «вельмі лёгкадумна» былі дапушчаны да выбараў.

Наперакор іншым органам друку, «Дзень Польскі» адкрыта заяўляе, што трэба лічыцца са зьменаю лініі замежнае палітыкі Англіі. Газэта падкрэсьлівае, што гэтай вымене надаюць вялікае значэньне Нямеччына і СССР. Газэта лічыць гэта вельмі важным.

Спэцыяльны карэспандэнт «Работніка» перадае сваё інтэрв'ю з Макданальдам, пры гэтым падкрэсьлівае, што Макданальд гатовы стварыць новы ўрад бяз усякае згоды з іншымі партыямі. Макданальд заявіў карэспандэнту, што ён намеран працягваць у пытаньнях замежнае палітыкі тую лінію, якой ён прытрымліваўся ў 1924 г. і якая потым была адхілена кансэрватарамі.

Індыя не чакае нічога добрага ад ураду Макданальда

ЛЁНДАН, 3. Як паведамляюць з Алалхабаду, лідэр індыйскіх нацыяналістых Мацілал-Нэру заявіў, што ён ня бачыць ніякіх падстаў, каб захапляцца перамогаю рабочае партыі.

«Лідэры рабочае партыі,—сказаў Мацілал-Нэру,—падтрымлівалі палітыку кансэрватыўнага ўраду ў важнейшым пытаньні аб камісіі Саймона. У іншых выпадках яны таксама праявілі сябе, як заядлыя імпэрыялістыя. Зьмена ўраду ў Англіі ня мае вялікага значэньня для Індыі.

Пробным каменем будуць адносіны рабочае партыі да становішча што стварылася ў выніку адтэрміноўкі віцэ-каралём выбараў у заканадаўчы сход Індыі. Гэта мела на мэце ўтаіць ад грамадзкае думкі адносіны выбаршчыкаў да камісіі Саймона».

****

Палякі правакуюць сутычкі на літоўскай граніцы

ВАРШАВА, 3. Польскі друк дагэтуль падтрымлівае ўражаньне, што на польска-літоўскай граніцы ня ўсё добра. Дасягасцца гэта штодзённымі паведамленьнямі аб пагранічных польска-літоўскіх сутычках.

У апошнія дні ў мэтах антылітоўскае прапаганды была скарыстана сутычка паміж польскай каталіцкай працэсіяй і літоўскімі арганізацыямі ў пагранічнай мясцовасьці на літоўскай тэрыторыі.

Саюз польскага студэнцтва, знаходзячыся пад уплывам пілсудчыкаў, апублікаваў у друку рэзалюцыю, прынятую на апошнім сходзе саюзу, якая пратэсуе супроць пакараньня сьмерцю Басіліуса, які рабіў замах на Вальдэмараса, а таксама супроць абвінавачаньняў па адрасу Польшчы ў арганізацыі замаху на Вальдэмараса.

Голад у Люблінскім ваяводзтве

ВАРШАВА, 3. У польскіх газэтах зьявілася паведамленьне, што ў выніку мінулагодняга недароду, рад паветаў Люблінскага ваяводзтва галадуюць. Становішча сялянства гэтых паветаў катастрафічнае. У бягучым годзе ў гэтых мясцовасьцях чакаецца недарод. У некаторых мясцох ужо зараз загінула да 50 проц. ураджаю. Створан спэцыяльны камітэт дапамогі галадуючым у Люблінскай акрузе.

У ГАЛІЦЫІ ЗЬНІШЧАНЫ ПАСЕВЫ

ВАРШАВА, 1. Паводле паведамленьняў газэт, з многіх раёнаў Заходняй Галіцыі атрыманы весткі аб тым, што градам зьнішчаны пасевы і сады. Ёсьць небясьпека, што паўтарыцца катастрофа градабіцьця 1927 году.

Усерасійскій зьезд сялянскіх пісьменьнікаў

МАСКВА, 3. У цэнтральным доме селяніна адкрыўся першы ўсерасійскі зьезд сялянскіх пісьменьнікаў. Тав. Кержанцаў у сваім прывітаньні сказаў:

«Сялянскія пісьменьнікі ўпяршыню сабраліся на зьезд зараз, калі партыя і ўся краіна з асаблівай увагай сочаць за сацыялістычнай перабудовай вёскі. Клясавая барацьба ў вёсцы натуральна адлюстроўваецца ў сялянскай літаратуры. Такія паэты, як Клюеў, або Арэшын зьяўляюцца найчысьцейшымі выказьнікамі кулацкіх настрояў. Але ўсё бліжэй і бліжэй набліжаюцца сялянскія пісьменьнікі да пісьменьнікаў пралетарскіх. Іх творчасьць усё больш і больш становіцца творчасьцю новае вёскі, у будаўніцтве якой аднолькава зацікаўлены і пралетарыят і вясковая беднота».

Ад імя Сялянскага Інтэрнацыяналу зьезд вітаў італьянскі сялянскі пісьменьнік т. Ніколеці.

«Нідзе, апрача СССР, нельга ўявіць сабе самога факту зьезду сялянскіх пісьменьнікаў,—сказаў Ніколеці. Гэта немагчыма ўжо таму, што на капіталістычным, або фашысцкім захадзе сапраўдны селянін ня можа стаць пісьменьнікам».

Зьезд, пад гучныя воплескі, пастанавіў паслаць прывітаньні ЦК УсеКП(б), Камуністычнаму Інтэрнацыяналу і Сялянскаму Інтэрнацыяналу. Пасьля прывітаньняў, з паўтарагадзінным дакладам выступаў тав. Луначарскі, які намеціў шляхі сучаснай сялянскай літаратуры. Сялянская літаратура, — закончыў ён свой даклад,—павінна ўзяць на сябе задачу ўзмацненьня сувязі пралетарыята з сялянствам. У выкананьні гэтай задачы сялянская літаратура павінна і зможа адыграць першую пасьля зьяваў эканамічнага парадку, ролю.

Рост забастовачнай хвалі ва Францыі

60 параходаў стаяць бяз руху

ПАРЫЖ, 3. У радзе галін францускае прамысловасьці забастовачны рух пашыраецца. У Парыскім раёне за апошні час моцна ўзрос рух сярод мэталістых.

На фабрыцы ваеннае авіяцыі Сальмсона і на аўтамабільным прадпрыемстве Амількар, **бастуе 2 тысячы чалавек.** Адміністрацыя аўтамабільнага прадпрыемства Пэжо **абвясьціла лёкаут 1.400 мэталістым,** у адказ на высунутыя рабочымі патрабаваньні. На радзе іншых прадпрыемстваў мэталічнае прамысловасьці рабочыя таксама высоўваюць патрабаваньні аб павялічэньні заработнае платы і палепшаньні ўмоў працы. У дрэваапрацоўчай прамысловасьці бастуе **каля 3-х тысяч рабочых мэблявае вытворчасьці,** патрабуючы павышэньня зарплаты. У Руане забаставалі маракі, якія патрабуюць павялічэньня зарплаты і высунулі рад іншых патрабаваньняў. У выніку забастоўкі, у парту няма руху. **Стаяць 20 параходаў. У парту Аран (Паўночная Афрыка) забаставалі 3.000 докераў. У парту стаяць бяз руху звыш 40 параходаў.**

***

ПАРЫЖ, 3. Сельска-гаспадарчыя рабочыя раёну Камарг пасьля 3-хдзённае забастоўкі аднавілі работу, бо гаспадары згадзіліся ўвесьці 8-мігадзінны рабочы дзень і палепшыць умовы жыцьця і харчы батракоў. Перамога атрымана дзякуючы кіраўніцтву унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыі працы.

***

ПАРЫЖ, 3. Агэнцтва Гавас паведамляе: «У сувязі з забастоўкаю звольнены 121 працаўнікоў бандэрольных адпраўленьняў. Паштова - тэлеграфныя служачыя адмовіліся замяняць звольненых. Часова бандэролі разносяць паліцэйскія, але ня ў поўным абхваце.

„Свабода" выбараў ва Францыі

РАЗГОН КАМУНІСТЫЧНАГА САМАКІРАЎНІЦТВА Ў РЫЎСАЛЬЦЕ

ПАРЫЖ, 2. На апошніх муніцыпальных выбарах у Рыўсальце перамогу атрымаў сьпіс камуністых.

Рэакцыйны блёк выступіў супроць камуністых, выбары згодна яго патрабаваньню былі апуляваны і камуністычны мэр Рыўсальту Ружон быў арыштаваны. Ружона і яго сакратара абвінавацілі ў тым, быццам яны захавалі выбарчыя бюлетэні, каб арабіць немагчымай праверку падліку галасоў.

У сапраўднасьці-ж справа стаяла інакш. Калі быў абвешчан вынік выбараў, у мэрыю ўварваліся прыхільнікі забалётываранага сьпісу. У час учыненага імі разгрому, выбарчыя бюлетэні зьніклі. У выніку камуністычны мэр і сакратар мэрыі Рыўсальту прыгавораны Тарпіньянскім судом (бяз прысяжных засядацеляў) першы да двух месяцаў турмы і пазбаўленьня грамадзянскіх правоў на два гады, другі—да трох месяцаў турмы і пазбаўленьня грамадзянскіх правоў на 3 гады.

У дзень суду Тарпіньян быў перапоўнены вакольнымі рабочымі і сялянамі, якія прышлі прадэманстраваць сваю салідарнасьць з абвінавачанымі.

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕ ЛІКВІДАТАРАЎ З ЧЭХА-СЛАВАЦКАЕ КАМПАРТЫІ

ПРАГА, 3. Адбыўся пленум ЦК кампартыі Чэха-Славакіі. Рэзалюцыя пленуму зазначае, што сучасная палітычная становішча цалкам пацьвярджае правільнасьць пастаноў 6-га кангрэсу Камінтэрну і 5-га зьезду КПЧ, намячае рад палітычных кампаній і асабліва падкрэсьлівае значэньне намечанага на 1-га жніўня дня дэманстрацыі пратэсту супроць вайны і ў абарону СССР.

Згодна прапановы палітбюро, пленум аднагалосна пастанавіў выключыць з партыі галоўных правадыроў ліквідатараў, пацьвердзіў усе пастановы аб выключэньні ліквідатараў, прынятыя візавымі партыйнымі арганізацыямі і даў палітбюро дырэктыву выключаць з партыі ўсіх членаў партыі, якія салідарызуюцца з ліквідатарамі. У заключэньне рэзалюцыя пленуму падкрэсьлівае, што барацьба супроць правае небясьпекі ў партыі не закончана і што яна і надалей застасецца галоўнай унутры-партыйнай задачай.

Працэс забойцы узбэкскага пісьменьніка Хакім-Задэ

САМАРКАНД, 4. У кішлаку Шахімардане Фэрганскае акругі пачаўся паказальны працэс па справе аб забойстве вядомага узбэкскага пісьменьніка Хакім-Задэ.

Як кажа паданьне, 500 год таму назад у Шахімардане быў пахаваны нейкі сьвяты, да магілы якога штогодна зьбіраюцца на паклон дзесяткі тысяч багамольцаў і прыносяць багатыя падарункі мулам.

Хакім-Задэ быў камандыраваны ў Шахімардан Узбэкскім урадам для анты-рэлігійнай прапаганды. На працягу некалькіх месяцаў яму ўдалося арганізаваць моцнае батрацкае ядро, стварыць буйны калгас, клюб і інш. Усё гэта выклікала моцнае азлабленьне духавенства. І калі ў сакавіку батракі выступілі з адкрытым патрабаваньнем ліквідаваць Шахімарданскія сьвятыні, шэйхі паранылі забіць Задэ.

18-га сакавіка натоўп фанатыкаў, на чале з муламі, забілі Задэ, зьверскі разарваўшы яго труп, разграмілі чырвоную чайхану і абязброілі міліцыю. Сьледзтва выявіла, што злачынства было падрыхтавана загадзя на некалькіх патайных нарадах мулаў і шэйхаў. На лаўцы падсудных 54 чал.

Масавыя дэманстрацыі нямецкіх рабочых

НАПЕРАКОР ТЭРОРУ САЦЫЯЛ-ЦЭРГІБЭЛЯУ

Паліцыя зьбіла камуністычных дэпутатаў

БЭРЛІН, 3. Учора ўваколіцах Бэрліну, у Лукенвальдзе, Эбэрсвальдзе, Брандэнбургу і Франкфурце на Одэры адбыліся чырвоныя вборы рабочых Бэрліну і Бэрлін-Брандэнбурскае акругі пад лёзунгамі: «Наперакор усяму «рот-фронт» (чырвоны фронт—баявы покліч саюзу чырвоных франтавікоў), «Прэч тэрар паліцэйскіх сацыялістых», «Выходзьце з партыі забойцаў рабочых», «Абараняйце СССР».

Ня гледзячы на праліўны дождж, у вулічных дэманстрацыях і мітынгах усюды прымалі ўдзел вялізныя масы рабочых.

Паліцыя ўсюды трымалася абураюча, асабліва ў Лукенвальдзе, дзе яна, між іншым, зьбіла камуністычных дэпутатаў Шульца і Бленкле (сакратар ЦК нямецкага камсамолу).

Усе рабочыя, вопратка якіх хоць крыху нагадвала форму распушчанага чырвонага саюзу франтавікоў, арыштоўваліся. Шапкі, рэмяні, куртці, падобныя на форму чырвонага саюзу франтавікоў, канфіскаваліся, **і рабочыя прымушаны былі дэманстраваць у адных кашулях, нясучы плякаты з надпісам: «У нас укралі вопратку».**

ПАД НАЦІСКАМ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 2. У камуністычных колах разгледаюць скасаваньне забароны дэманстрацый пад адкрытым небам, як посьпех барацьбы нямецкае кампартыі. У той-жа час не чакаюць якога-колечы паслабленьня барацьбы ўлады супроць нямецкае кампартыі.

Дапаможам ахвярам сацыял-фашызму

Агульны сход супрацоўнікаў Белхарчтрэсту і Белдзяржсьпірту, заслухаўшы інфармацыю аб крывавых падзеях у Бэрліне ў дзень 1-га мая, рашуча пратэстуе супроць здрадніцкага паліцэйскага тэрору, які праводзіцца пры непасрэднай дапамозе і ўдзеле сацыял-дэмакратычных здраднікаў і сацыял-фашыстых.

Агульны сход лічыць сваім пралетарскім абавязкам аказаць магчымую дапамогу ахвярам першамайскіх падзей і пастанаўляе адлічыць з сваёй месячнай пэнсіі 1 проц. аднаразовага ўзносу.

Разам з гэтым агульны сход надсылае сваё братэрскае прывітаньне змагару—нямецкаму пралетарыяту і заклікае яго ня спыняць сваёй барацьбы, памятуючы, што ўсё нашы сымпатыі на яго баку і што мы дапамагчы яму заўсёды гатовы.

* *

Заслухаўшы даклад тав. Дзэрнакова аб першамайскіх здарэньнях у Бэрліне, Віцебская раённая канфэрэнцыя асьвятлікаў з абурэньнем пратэстуе супроць крывавае расправы над рабочымі на вуліцах Бэрліну.

Канфэрэнцыя ганьбіць катаў рабочае клясы—буржуазію і яе прысьпешнікаў сацыял-дэмакратаў і ўвесь 2-гі Інтэрнацыянал, які лічыць сябе правадыром пралетарыяту, а сапраўды абараняе інтарэсы буржуазіі і расстрэльвае рабочых.

На дзікія зьдзекі над рабочай клясай канфэрэнцыя **адказвае адлічэньнем 3 проц. заработку на дапамогу сем'ям рабочых,** што загінулі на вуліцах Бэрліну і абяцае прыняць гарачы ўдзел у арганізацыі і ўзмацненьні радоў МОПР'у.

***

Чырвонаармейцы і камандна-палітычны склад № 7-га кавалерыйскага эскадрону разам з партыйнымі і прафэсіянальнымі арганізацыямі і працоўнымі мястэчка Грозава, заслухаўшы паведамленьне пра Бэрлінскія падзеі, ганьбуюць здрадніцкай рабочае клясы, сацыял фашысцкіх лёкаяў буржуазіі.

Рабочыя Нямеччыны і іншых краін, шчыльней злучайце рады з сялянствам, цьвёрда ідзіце наперад пад сьцягам Камінтэрну!

За вас Чырвоная армія, за вас Саюзны пралетарыят, а таксама пралетарыят усяго сьвету!

***

Вучні 2-й Менскай вячэрняй рабочай школы павышанага тыпу МБЖ чыг. пасьля дакладу аб першамайскіх падзеях у Нямеччыне пастанавілі пачаць збор сродкаў на карысьць дзяцей забітых і пацярпеўшых нямецкіх рабочых. Вучні ужо сабралі і ўнесьлі ў МОПР 15 руб. 82 к. Школа выклікае пасьледаваць яе прыкладу 1-ю чыгуначную вячэрнюю школу павышанага тыпу.

КРЫВАВЫ БАЛЯНС НЯМЕЦКАЕ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫІ

На варце інтарэсаў вугальных баронаў і абшарнікаў. — Прымусовы арбітраж над паліцэйскім тэрорам.—Павышэньне падаткаў і ўрэзваньне сацыяльнай дапамогі. Крывавыя расправы ката—Цэргібэля. — Толькі камуністычная партыя цьвёрда змагаецца за інтарэсы працоўных.

Зьезд нямецкае сацыял-дэмакратыі ў Магдэбургу сабраўся якраз на пачатку другога году існаваньня ў Нямеччыне, каліцыйнага ўраду пад старшынством сацыял-дэмакрата Мюлера. Разгляд вынікаў першага году каліцыі зьявіўся восьсю, вакол якое круціліся ўсё нарады і спрэчкі зьезду. Адзін з рідніейшых сацыял-дэмакратычных верхаводаў Брайтшайд, які рабіў даклад ад імя парляманцкае фракцыі сацыял-дэмакратыі, вымушаны быў прызнаць, што за першы год «на карысьць рабочае клясы зроблена вельмі мала» і вінаваціў у гэтым... халады, якія, моў, перашкодзілі пасьняхова змагацца з узростам беспрацоўя. А райхсканцлер Мюлер проста заявіў, што сацыял-дэмакратычныя міністры вышэй за ўсё ставяць дабро дзяржавы і толькі ім кіруюцца ў сваёй дзейнасьці. Але пры ўважлівым агляздзе аказваецца, што гэтае «дабро дзяржавы» ва ўсіх важнейшых мерапрыемствах каліцыйнага ўраду зьяўляецца «дабром» толькі для буржуазіі і «злом» для рабочае клясы і што ў істоце нямецкая сацыял-дэмакратыя старанна дапамагае буржуазіі вясьці Нямеччыну па шляху ўсё большае фашызацыі. «Посьпехі», дасягнутыя ёю на гэтым шляху такія, што да іх варта прыглядзецца бліжэй.

Самым першым мерапрыемствам каліцыйнага ўраду быў дазвол на павышэньне вугальных цэнаў. 28-га чэрвеня мінулага году дзяржаўная вугальная рада пастанавіла павялічыць цану на верхня-сілескі вугаль на 1 марку на тону, а ўрад зацьвердзіў павышэньне. У працягу году адбылося яшчэ некалькі павышэньняў, якія добра даліся ў знакі малааможным колам насельніцтва асабліва ў сувязі з надзвычайна халоднаю зімою. Гэтая прыхільнасьць каліцыйнага ўраду да вугальных баронаў прычынілася да моцнага ўзьдараньня жыцьця і абніжэньня становішча шырокіх працоўных масаў. Але каліцыйны ўрад аказаўся шчодрым ня толькі ў адносінах да вугальных баронаў. Ранейшы ўрад буржуазнага блёку, угаджаючы абшарнікам, налажыў высокія мыты на прывоз марожанага мяса. Каліцыйны ўрад пад старшынством сацыял-дэмакрата ня толькі ўтрымаў іх, але яшчэ значна абмежаваў і прывоз жывое скаціны, што ў выніку таксама прычынілася да павялічэньня дарагоўлі.

У часы ўрадаваньня буржуазнага блёку сацыял-дэмакраты в дэмагагічнымі мэтамі трэбавалі вышэйшыя падаходнага падатку з ніжэйшых катэгорый і абяцалі пры сваім прыходзе да ўлады даць у гэтай справе палёгку рабочым. А пасьля ўваходу ва ўрад сацыял-дэмакратычная фракцыя ў рэйхстагу 12 ліпеня мінулага году галасавала проціў сваіх-жа ранейшых прапаноў. Рабочыя масы, якія паверылі сацыял-дэмакратам, былі яшчэ раз бяссорамна ашуканы.

У арбітражным вырашэньні шматлікіх канфліктаў паміж рабочымі і прамыслоўцамі сацыял-дэмакратычныя міністры кожны раз станавіліся на бок прамыслоўцаў і часта зрывалі забастоўкі, якія мелі ўсе шансы на посьпех. Такім чынам сацыял-дэмакраты неадкрацьць адыгралі ролю простых прадаўцоў рабочае клясы. Яшчэ летам 1928 г. міністр працы Віссэль абвясьціў абавязковым арбітраж для саксонскіх тэкстыльных рабочых, які прадбачыў тыднёвую працу да 60 гадзін (на 10 гадзін у дзень). У сваім стараньні выслужыцца перад буржуазіяй сацыял-дэмакратычныя арбітры часта выдавалі арбітражныя прысуды яшчэ горшыя для рабочых, чым прысуды арбітраў ранейшага чыста буржуазнага ўраду. А падпарадкаваньне рабочых выданым арбітражам дасягалася тэрарам і гвалтам. У часе вялікага лёкаўту гарнякоў, урад, каб прымусіць рабочых прыняць сацыял-дэмакрата Зэвэрынга ў якасьці арбітра, прыгразіў скасаваць прызнаную падпаіскам мас камунальную дапамогу злёкаутаваным. Вісаль пасьля 14-дзённае забастоўкі рабочых вэрфяў, навязаў ім ганебны арбітраж, хоць па прызнаньні нават рэфармісцкіх прафсаюзных дзеячоў рабочыя былі блізкі ўжо да перамогі.

Пад час надзвычайна халоднае зімы каліцыйны ўрад адабраў ад так званых сэзонных беспрацоўных дапамогу в фонду беспрацоўя. Дапамога ім была ўзложана на «спэцфонд», в якога аднак, сэзонныя беспрацоўныя, або зусім нічога не атрымлівалі, або атрымалі самую мізэрную дапамогу.

Справа пашырэньня дапамогі ў часе крызысаў па ўсе прафэсіі спаткала рэзкае супраціўленьне з боку каліцыйнага ўраду, прычым, сацыял-дэмакраты ня толькі

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

МАСЫ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ЯК БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА ПАРТЫІ

Асобныя задачы і мэтады чысткі і праверкі вясковых ячэек

Інструкцыйны ліст парткалегіі ЦКК УсеКП(б)

У дадатак да агульнай інструкцыі па арганізацыі і правядзеньні чысткі і праверкі радоў УсеКП(б) ЦКК УсеКП(б) прапануе пры чысткі і праверцы вясковых ячэек кіравацца наступнымі меркаваньнямі:

Пры чысткі і праверцы вясковых ячэек раней усяго неабходна ўлічваць наступную характарыстыку, даную ім лістападаўскім пленумам ЦК УсеКП(б): «У складзе вясковых арганізацый усё яшчэ зусім нязначна ўдзельная вага пралетарскіх элемэнтаў і проста мізэрны кадр калгасьнікаў. Побач з гэтым у іх складзе ў некаторых выпадках значная частка заможных сялян, а часамі і элемэнтаў, што зблізіліся з кулацтвам, разлажыліся, зусім чужыя рабочай клясе. Гэта робіць зусім неадкладнай задачу рашучага паляпшэньня, карэннай чысткі і значнага абнаўленьня гэтых арганізацый».

Разам з тым трэба ўлічваць таксама і тую акалічнасьць, што вясковым арганізацыям прыходзіцца праводзіць партыйную работу ў значна больш цяжкіх умовах, чым арганізацыям гарадзкім: малалікасьць вясковых ячэек, іх раскіданасьць і часта вялікая тэрытарыяльная аддаванасьць ад кіруючых парторганаў; акружэньне іх дробна-ўласніцкімі масамі культурна больш адсталымі, чым пралетарыят, і часта гаспадарча залежнымі ад кулакоў; націск на вясковых камуністых бюракратызму вышэйшых дзяржаўных устаноў і грамадзкіх каапэрацыйных і іншых арганізацый, што часта абумоўлівае скрыўленьне вясковымі ячэйкамі лініі партыі: непасрэдны націск на вясковых камуністых з боку капіталістычных элемэнтаў вёскі, які выражаецца часта ў тэроры; нізкая матар'яльная забясьпечанасьць вясковых камуністых-служачых і беднякоў і, нарэшце, вельмі невялікі лік вытрыманых бальшавікоў, асабліва падполькоўцаў, што могуць забясьпечыць больш правільнае кіраўніцтва партарганізацыяй.

Пералічаныя вышэй труднасьці ва ўмовах работы вясковых арганізацый, ад іх незалежныя, ня могуць не адбівацца адмоўна на якасьці іх работы і на паводзінах асобных вясковых камуністых. Гэту акалічнасьць неабходна ўлічваць як пры ацэнцы ячэйкі цалкам, так і ў ацэнцы асобных камуністых.

Трэба рашуча ачысьціць вясковыя ячэйкі ад пранікшых у іх элемэнтаў клясава-чужых, або якія зрасьліся з кулацкімі элемэнтамі—гандлярамі, баямі і духавенствам, ад членаў партыі, што праводзяць палітыку, якая адштурхвае ад партыі батракоў і беднякоў, ад. партыйцаў, што ня прымаюць удзелу ў правядзеньні ў жыцьцё мерапрыемстваў па сацыялістычным перабудаваньні сельскае гаспадаркі, ад чыноўніцкіх элемэнтаў, што ня выконваюць дырэктыў партыі аб апоры на беднату і аб саюзе з серадняцкімі масамі сялянства, ад членаў партыі, гаспадарчае абрастаньне якіх засланіла перад імі задачу камуністычнай прапаганды і арганізацыі вёскі, ад злосных парушыцеляў рэвалюцыйнай законнасьці, якія злоўжываюць уладай у асабістых мэтах.» 1)

Разам з тым, неабходна пры праверцы ачышчэньня адносіцца да вясковых камуністых, сапраўды адданых партыі, асабліва да ўдзельнікаў грамадзянскай вайны, да камуністых-батракоў і батрачак, да сялянак-бяднячак і сераднячак, што ня могуць праявіць вялікай актыўнасьці, з прычыны асабліваецкай бытавога ўкладу вёскі, а таксама да камуністых з вясковай інтэлігенцыі. Трэба старанна выяўляць у кожным асобным выпадку прычыны і ўмовы праступкаў гэтых камуністых і ролю ячэйкі цалкам у справе іх партыйна-палітычнага выхаваньня і папярэджаньня праступкаў.

Пры праверцы адказных валасных і раённых працаўнікоў да іх неабходна прад'яўляць патрабаваньні ў адносінах выразнага правядзеньня імі клясавай лініі, а таксама іх асабістай актыўнасьці ў барацьбе з бюракратызмам, сувязі з масамі і апоры на іх у сваёй рабоце.

Прад'яўляючы да кожнага камуністага патрабаваньне ўдзелу ў арганізацыі калектыўных гаспадарак, або вытворча-каапэрацыйных аб'яднаньняў данага раёну, неабходна пры практычным вырашэньні пытаньня аб кожным члене партыі ўнікаць фармальных адносін да камуністага, што вядзе індывідуальную гаспадарку, улічваючы, ці ёсьць у даным раёне, сяле і г. д. умовы для пасьпяховай арганізацыі калектыўнае гаспадаркі, ці не павядзе ўваход таго або іншага камуністага ў існуючую ў даным раёне калектыўную гаспадарку да разбурэньня яго індывідуальнай гаспадаркі без карысьці для калектывізацыі і г. д.

Правяраючы работу вясковых арганізацый, неабходна ў дадатак да пункту 28 разьдзелу IV агульнай інструкцыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на наступныя пытаньні:

1) роля ячэйкі ў справе калектывізацыі і каапэраваньня сельскае гаспадаркі, у справе пашырэньня пасеваў, ва ўзьнятьці ўраджайнасьці;

2) адносіны ячэйкі да выпадкаў выкрыўленьня клясавай лініі ў вёсцы і яе роля ў папярэджаньні, своячасовым выкрыцьці і ліквідацыі гэтых выпадкаў і ў барацьбе з правымі ухілам;

3) стан масавай работы ячэйкі і яе ўдзел у кампаніях (падатковая, хлебазагатоўчая, перавыбары саветаў);

4) як ячэйка праводзіць кіраўніцтва работай з беднатой і батракамі і стан гэтай работы;

5) як пастаўлена барацьба ячэйкі супроць выпадкаў згуртаваньня асобных камуністых з клясава-чужым элемэнтам; адносіны ячэйкі да выпадкаў п'янства камуністых з кулацтвам, што прыводзяць да больш моцнай згуртаванасьці;

6) мерапрыемствы ячэйкі і валаснога або раённага камітэту па калектывізацыі гаспадаркі камуністых-сялян.

Трэба выкрываць выпадкі парушэньня вясковымі камуністымі рэвалюцыйнай законнасьці, а таксама выпадкі кабарніцтва, зажыму, камандаваньня, злоўжываньня службовым становішчам, прасьледваньня селькораў, злоўжываньняў пры разьмеркаваньні фондаў беднаты, заведама няправільнага перабкладваньня с.-г. падаткам бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак і выніжэньня падатку з кулацтва, заведама няправільнае пазбаўленьне выбарчых праў, скажэньняў пры хлебазагатоўках.

У часе чысткі і праверкі вясковых арганізацый важнейшай іх арганізацыйнай задачай і задачай праверкомаў павінна быць забесьпячэньне сапраўднага актыўнага і сапраўды масавага ўдзелу батракоў, беднаты і серадняга сялянства ў чысткі і праверцы. Трэба з гэтай мэтай з належнай удумлівасьцю і дакладнасьцю аднесьціся пават да такіх дэталяй гэтай задачы, як арганізацыя прыёму вусных і пісьмовых заяў, вызначэньне месца і часу і месца адкрытых сходаў і своячасовасьць паведамленьня аб іх і г. д.

Места і час сходаў ячэйкі, якая праводзіцца, трэба выбіраць з такім разьлікам, каб іх маглі ў магчыма большай колькасьці наведваць рабочыя саўгасаў, члены с.-г. камун і арцеляй, батракі. Прыцягненьне гэтых пластоў насельніцтва да ўдзелу ў чысткі і праверцы мае вялікае значэньне ня толькі з пункту погляду іх ацэнкі ячэйкі і паасобных камуністых, але і з пункту погляду вярбоўкі ў партыю лепшых, актыўнейшых іх прадстаўнікоў. Удзел гэтых таварышоў у чысткі і праверцы дапаможа ім усьвядоміць задачы партыі і правы і абавязкі камуністых і з большай сьвядомасьцю аднесьціся да ўступленьня ў партыю.

Трэба прыцягваць на адкрытыя сходы ячэек прадстаўнікоў вясковай інтэлігенцыі, якія адданы савецкай уладзе і актыўна працуюць у перабудаваньні вёскі (аграномы, каморнікі, лясьнічыя, дактары, педагогі і інш.), асабліва пры ацэнцы работы ячэйкі па правядзеньні сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, пашырэньні пасеваў, узьнятьці ўраджайнасьці.

Прымаючы ўсе неабходныя меры па прыцягненьні да чысткі і праверкі магчыма большае колькасьці паказаных вышэй груп беспартыйных, трэба разам з тым мець на ўвазе магчымасьць спроб скарыстаньня чысткі і праверкі ў антыпартыйных і антысавецкіх мэтах кулакамі і падкулачнікамі. У мэтах папярэджаньня гэтай магчымасьці паперша, не дапускаць на адкрытыя сходы ячэек кулакоў, пазбаўлены выбарчых праў і т. п. чужы і варожы элемэнт, падругое, даваць адпор пралезшым на сходы падкулачнікам у іх спробах дэмагагічнага ашалмаваньня партыі і паасобных камуністых і, патрэцяе, цярпліва растлумачваць беднаце і серадняком усе пытаньні партыйнай палітыкі ў вёсцы, якія іх хвалююць.

У гутарках і дакладах на адкрытых сходах аб задачах чысткі і праверкі трэба дакладна растлумачваць, што чыстка праводзіцца зусім не з-за агульнага недавер'я партыі да сваіх вясковых ячэек, а з мэтаю аказаньня дапамогі ў цяжкой працы вясковых ячэек, уцягненьня ў партыю батракоў і беднаты і ачышчэньня партыі ад выпадковага, чужога рабочай клясе элемэнту.

У мэтах эканоміі часу і працудкуцьнасьці работы праверкомаў неабходна яшчэ да сканчэньня праверкі тэй ці іншай вясковай ячэйкі своячасова паведамляць у наступную ячэйку дакладны каляндарны плян яе праверкі, каб яна здолела своячасова паведаміць камуністых і беспартыйную масу аб часе і месцы сходу і г. д.

Чыстка і праверка вясковых ячэек павінна быць у найбольшай ступені скарыстана адпаведнымі камітэтамі ў мэтах іх падрабязнага інструктаваньня і дзелавога канкрэтнага вывучэньня пытаньня аб усебаковай матар'яльнай і арганізацыйнай дапамозе ім.

1) Пастанова красавіковага пленуму і XVI канфэрэнцыі.

Ачысьціць партыйныя рады ў вёсцы ад кулакоў і падкулачнікаў

Той размах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, які намечаны пяцігадовым плянам, можна ажыцьцявіць толькі пры вялікім напружаньні ўсіх сіл нашай партыі і пры апчадным выдаткаваньні сродкаў пралетарскае дзяржавы. Усялякае адхіленьне ад генэральнай лініі нашай партыі пагражае зрывам нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву. Злачыннае скарыстоўваньне годнасьці члена партыі падрывае давер'е шырокіх рабочых і сялянскіх мас. Гэта паслабляе магутнасьць дзяржавы і цягне за сабой недавыкаканьне ўзятых абавязкаў. Мы ведаем з практыкі, што ў радох нашай камуністычнай партыі ёсьць і такія людзі, якія хочуць зьмяніць генэральную лінію партыі. Ёсьць і такія, якія карыстаюцца годнасьцю члена партыі, каб рабіць свае асабістыя справы, якія абкрадваюць казну, крыўдзяць беднату, апякунствуюць кулаком, п'юць і наогул робяць бясьпушны.

У вёсцы, у вясковых ячэйках іх шмат. Гэта кулакі і падкулачнікі, а то і проста камуністыя што разлажыліся. Усіх іх трэба выкінуць з радоў партыі. Гэта толькі палегчыць будаўніцтва сацыялізму. Хаця на некаторы час партыя па колькасьці паменшыцца, але якасна яна выйграе. А аздараўленьне партыі няўхільна прыводзе да прыёму ў партыю новых сумленных рабочых і сялян. Кулак і падкулачнік шкодны партыі таму, што яны гнуць лінію не на сацыялістычнае зямляробства, а на абагачэньне ў рамках індывідуальнае гаспадаркі. Такое абагачэньне магчыма толькі за кошт другога селяніна, за кошт яго згаленьня. Якімі словамі не прыфарбоўваліся-б такія людзі, яны не камуністыя, яны ворагі камунізму. Трапляючы ў праўленьне каапэратыву і ў сельсавет такія ілжакамуністыя імкнуцца палегчыць падаткоўае абкладваньне кулакоў, садзейнічаюць яго абагачэньню і менш усяго дапамагаюць беднаце. Гэтым яны скажаюць палітыку камуністычнай партыі і савецкай улады, ганьбяць годнасьць партыйца. Во маса знаёміцца в партыяй па тых камуністых, з якімі яна сустракаецца.

ЛАЦІС.

На раённых партыйных канфэрэнцыях

Фрунзаўская раённая партканфэрэнцыя

Даклад тав. Тамашэўскага аб рабоце Менскага АК КП(б)Б

Уся работа акруговага камітэту праходзіла пад знакам мабілізацыі партыйных мас на барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, на барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі. Менская арганізацыя КП(б)Б аднадушна асудзіла погляды правых апартуністых і прымірэнцаў. АК своячасова рэагаваў на канкрэтныя праяўленьні правага ўхілу ў штодзённай практычнай рабоце. Скажэньне клясавай лініі ў палітыцы Наркамзему, тэатральную дыскусію, грэскую справу, заявы трох пісьменьнікаў—АК і арганізацыя правільна ацанілі, як скрытыя і яўныя праяўленьні правага ўхілу. Акруговы камітэт і ўся арганізацыя, не паслабляючы барацьбы з рэшткамі трацкісцкай контр-рэвалюцыі, рашуча ўдарылі па права-ўхілісцкіх капітуляцкіх настроях у сваіх радох, па прымірэнцтве да правага ўхілу. Трэба адзначыць, што ня ўсе члены і кандыдаты партыі ўсьвядомілі сутнасьць правага ўхілу, нявыстарчальна вывучылі сацыяльна-эканамічныя карэньні гэтага ўхілу. Мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на паляпшэньне нашай палітычнай вучобы. Узброеная ленінская непрымірымасьцю да ўхілаў ад генэральнай лініі партарганізацыя будзе яшчэ больш пасьпяхова праводзіць сваю работу на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

ПЫТАНЬНІ РОСТУ

XII-ты зьезд КП(б)В паставіў перад нашай арганізацыяй задачу ўзмацненьня работы па вярбоўцы ў партыю рабочых, батракоў і с.-г. рабочых. Як мы спраўляемся з гэтай задачай? Спраўляемся дрэнна. Агульны рост арганізацыі праходзіць невыстарчальна. Рост за лік рабочых ад варштату—зусім невыстарчальны. За першыя 4 месяцы гэтага году арганізацыя прыняла ў партыю каля 300 рабочых, прычым палову прынятых складаюць камсамольцы. Праслойка работніц у партарганізацыі вельмі нязпрыкметная. На гэты вучастак работы мы павінны накіраваць усе нашы сілы, скарыстаць усе магчымасьці.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЧЫСТКІ

Мы правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да чысткі. Пытаньне аб чысткі абмеркавана на адкрытых партсходах. Асобныя ячэйкі яшчэ да гэтага часу не разумеюць асноўных ідэёва-арганізацыйных прынцыпаў чысткі. Многія ячэйкі, ня гледзячы на тое, што другі пленум ЦК КП(б)Б выказаўся супроць складаньня характарыстык на асобных партыйцаў, займаліся гэтай справай. Некаторыя райкомы фармальна падыйшлі да складаньня характарыстык. Характарыстыкі складзены неадвальняюча. Некалькі слоў аб чысткі савецкага апарату. Да чысткі мы падрыхтаваны ня кепска. Усё-ж трэба паказаць на слабасьць работы сярод жанчын. Мы не падрыхтавалі кадраў замены на месца вычышчаных. Трэба сьмялей вылучаць рабочых і работніц ад варштату на кіруючую работу ў апараце.

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ

Правядзеньне перавыбарчай кампаніі было адным з самых важных задач у рабоце АК і арганізацыі. Вынікі перавыбараў сьведчаць аб тым, што мы на гэтым фронце вытрымалі палітычны экзамэн. Перавыбары прайшлі пры вялікай актыўнасьці рабочае клясы, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх колаў сялянства. Разам з гэтым па некаторых раёнах пры пазбаўленьні выбарчых праў былі дапушчаны перагібы. Многія яўрэі—дробныя местачковыя саматужнікі былі няправільна занесены ў сьпісы пазбаўленых. На гэтай глебе асобныя местачковыя арганізацыі дапусьцілі скажэньне нацыянальнай палітыкі партыі. АК своячасова выправіў гэтыя недахопы.

ПРАФСАЮЗЫ І МАСЫ

АК удзяляў вялікую ўвагу пытаньням прафсаюзнай работы і палітычнаму выхаваньню мас. Наша культурна-масавая работа праводзіцца дрэнна. Прафсаюзы не праяўляюць у гэтым напрамку належнай ініцыятывы. Вытворчае выхаваньне рабочых пастаўлена яшчэ горш. На нашых прадпрыемствах ня існуюць прагулы, рвацкія настрої, п'янства, хвасьцізм, хуліганства. Змагаліся з гэтымі зьявішчамі прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі слаба. У справе распаўсюджаньня другой пазыкі індустрыялізацыі прафсаюзам належыць пачэснае месца. Але замацаваць дасягнутыя посьпехі прафсаюзы не змаглі. За апошні час значна павялічыўся датэрміновы продаж аблігацый. Мы павінны разгарнуць шырокую кампанію за каразгарнуць шырокую кампанію за каразгарнуць шырокую кампанію за караз

Большая ініцыятыва шляхцьці у падрыхтоўчай рабоце па с.-г. падатку

У камісіі па вучоце аб'ектаў пралазяць заможнікі!.—Некаторыя сельсаветы, „каб набраць лічбу", у сьпісы па вызваленьні ад падатку ўключаюць моцныя гаспадаркі.—А ёсьць райвыканкомы, якія шукаюць і ня могуць знайсьці кулакоў—„у нас кулакі ня водзяцца".—Партыйнае кіраўніцтва ня ўсюды здавальняючае

Клясавая лінія скрыўляецца

«Абавязковай умовай посьпехаў партыі ў вёсцы зьяўляецца строгае захаваньне выраўнае клясавае лініі ва ўсіх галінах працы. Апора на беднату, моцны саюз з серадняком і далейшае ўзмацненьне наступленьня на кулака ёсьць незьмянная аснова палітыкі партыі».

Гэтую, зусім ясную Устаноўку ЦК УсеКП(б) прыходзіцца напамінаць у вязку з сельска-гаспадарчым падаткам. Бо ў радзе мясцовасьцяй БССР падрыхтоўка да гэтае найважнейшае палітычнае кампаніі праходзіць дрэнна, клясавая лінія парушаецца і неабходны самыя рашучыя меры да выпраўленьня дапушчаных памылак ці злоўжываньняў.

У практычным правядзеньні сельска-гаспадарчага падатку беднота павінна прыняць самы актыўны ўдзел. Партыйныя арганізацыі, райвыканкомы і сельсаветы павінны дабівацца, каб за прадстаўнікоў сялянства ў сельскай падлічальнай камісіі праходзілі выключна ці хаця-б пераважна беднякі і ні ў якім разе ні моцныя гаспадары ці кулакі.

Што-ж ёсьць на справе? У Дваранчанскім сельсавеце, Хойніцкага раёну, Гомельскае акругі, у камісію праходзіць гаспадар, які мае 10,5 дзес. зямлі, 5 галоў буйное і 11 галоў дробнае жывёлы. Кандыдатуру яго на сходзе беднаты высунуў прэзыдыум сельсавету. Гэта ня гледзячы на паліччa ў сельсавеце моцнае бадзяцкае групы і партыйнае ячэйкі. У Новасельскім сельсавеце (дзе ёсьць ячэйка ЛКСМВ) у камісію праходзіць гаспадар, які мае 8,5 дзес. зямлі, 5 галоў буйное і 15 галоў дробнае жывёлы.

Зразумела, гэтыя «прадстаўнікі» сядзяць у камісіі, як нямыя і сьлепыя, і толькі што актыўна не дапамагаюць утойваньню аб'ектаў абкладаньня. Сялянін, які трымае пры 4 з палов. дзес. пахаці 6 коняй паказвае камісіі толькі 120 руб. заработку ад возьніцтва, а «прадстаўнік» і сельсавет знаходзяць гэтую лічбу нармальнай, коць і дурань скажа, што для 120 рублёў заработку ня варта трымаць 6 коняй.

Беднату мы павінны поўнасьцю вызваліць ад абкладаньня. Але толькі беднату і ні ў якім разе ня моцнага гаспадара. Нельга зьмяняць якасьць колькасьцю. Між тым, у Новасёлкаўскім сельсавеце ў сьпісы беднаты прэзыдыум сельсавету, «каб набраць лічбу», уключае гаспадаркі, што маюць па 5-6 дзес. зямлі, па 4-5 галоў жывёлы і сотні рублёў заработку. Вось дык «клясавая лінія»!

Найважнейшая палітычная справа—індывідуальнае абкладаньне багацейшых кулакоў. Паводле пастаноў XVI партканфэрэнцыі і паводле закону трэба абкласьці індывідуальна «найбольш багатыя кулацкія гаспадаркі, асабліва тыя з іх, даход якіх не даволі поўна ўлічваецца пры абкладаньні на агульных падставах». Але нельга лічыць, што такіх кулакоў або зусім няма, або іх на пальцах пералічыш. Трэба шукаць, бо кулак заўсёды хавае свой сапраўдны твар. Як-жа шукаюць? Рэчыцкаму і Хойніцкаму РВК некаторыя сельсаветы ўжо ў красавіку напісалі, што ў іх, бачыце, «кулакі ня водзяцца». І да гэтага часу РВК не пацікавіліся, ці правільна гэтае паведамленьне. Чакаюць, пакуль пачнецца падлік аб'ектаў абкладаньня,—«тады і праверым». А тады якраз будзе позна, праца будзе змазана, з беднатой гэтае пытаньне як сьлед не прапрацуеш, і зноў пачнецца блытаніна. Выўленьне гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня — адказьнейшая палітычная задача і павінна праходзіць загадзя, самастойна і бяз сувязі з іншай працай.

Вельмі небясьпечым зьяўляецца настрой некаторых працаўнікоў раёнаў і сельсаветаў. У Хойніцкім раёне як быццам лічаць, што ў кулакі толькі тады можна залічаць, калі за руку яго злавіў у той час, як ён пазычаў бедняку грошы ці збожжа. Такім чынам, кулака, які мае 24 дзес. зямлі, 5 коняй, 9 кароў і 25 галоў дробнае жывёлы, абараняюць і старшыня Новасёлкаўскага сельсавету, і сакратар мясцовае ячэйкі ЛКСМБ: «ён, бачыце, ня мае ніякіх непрацоўных даходаў».

А па сходзе беднаты адразу выяўляецца, што гэта кулак (і рад іншых гэткіх гаспадароў) пазычае беднаце збожжа і грошы, прычым ставілася ўмова: замест процантаў адпрацаваць па некалькі дзён. Мала таго: гэтаму гаспадару і яшчэ 7 такім асобам абвешчаны грамадой байкот за няздачу хлеба. Між тым, сельсавет і сакратар ячэйкі ЛКСМВ, ня спытаўшыся беднату, адразу заявілі: «кулакоў у нас няма».

Зразумела, у справе выяўленьня непрацоўных даходаў патрэбна асьцярожнасьць. Нельга апірацца на чуткі, дапушчэньні і г. д. Але трэба поўнасьцю скарыстаць дапамогу беднаты, як гэта прадугледжана законам. Спроба паказвае, што групы і сходы беднаты — адзіны спосаб поўнага выяўленьня кулакоў. Між тым, беднота часта і ня ведае, што сельсавет ужо паведаміў у раён: «кулакоў у нас няма».

Мы тут прывялі найбольш выразныя прыклады скрыўленьня клясавае лініі ў сельгаспадатку. Факты, падобныя да гэтых, устаноўлены і ў некаторых іншых раёнах Гомельскае акругі. Вясспрэчна, яны ёсьць і ў іншых акругах. Таму неабходна як мага хутчэй выніпчыць іх. Больш за ўсё патрэбны партыйны нагляд і кіраваньне ў справе падрыхтоўкі да сельгаспадатку. Гэта найбольш датычыць індывідуальнага абкладаньня, вызваленьня беднаты і складу сельскіх падлічальных камісій.

М. К—к.

Падлік аб'ектаў абкладаньня праходзіць дрэнна

Чаму нам патрэбен правільны і поўны падлік аб'ектаў па сельска-гаспадарчым падатку?

1. Бяз гэтага падліку немагчыма правільнае разьмеркаваньне акладаў падатку; бо пры ўтойваньні аб'ектаў і моцны гаспадар пойдзе за серадняка або бедняка.

2. Паменшыўшы сёлета сальска-гаспадарчы падатак на значную суму, мы ня можам дапусьціць, каб ён яшчэ больш зьмяншаўся з прычыны ўтойваньня крыніц абкладанага даходу.

Акруговы і раённы апараты, улічваючы гэта, павінны былі прыняць усе меры, каб забясьпечыць посьпех падліку. На справе-ж гэтага не наглядаецца. Райвыканкомы прымаюўваюць да сельсаветаў сваіх упоўнаваженых, якія павінны ўвесь час падліку сачыць за працай сельсаветаў і інструктаваць іх. У радзе раёнаў значная частка гэтых упоўнаваженых або зусім ня выяжджала на месцы, або пакруцілася там адзін дзень і вярнулася. Сельсаветы (часта новыя па складзе) засталіся без належнага кіраваньня.

Выдатную ролю ў крыніцах даходу сялянства займаюць незямляробчыя заработкі. Весткі пра іх належала загадзя сабраць з розных устаноў і арганізацый і дасласць сельсаветам, як дапаможны матар'ял. Між тым, да гэтага часу (а падлік ужо ўсюды разгарнуўся) выбаркі не закончаны. Рэчыцкі РВК ня здолеў зрабіць адпаведныя выбаркі з зав. імя Томскага, хаця ён знаходзіцца над бокам. А в гэтага заводу сялянства суседніх вёсак зарабіла сотні тысяч рублёў.

Праверка паказаньняў платнікаў робіцца дрэнна. Часамі беднота паказвае, што ў данай вёсцы ўтоена шмат аб'ектаў, а РВК акладае праверку на некалькі дзён. Сельсавет правярае аб'екты, выяўляе шмат утоеных сьвіней і складае акт. А ў РВК разгляд гэтага акту адкладваецца да «чарговага прэзыдыуму». Між тым, сваячасовы разгляд і хуткае аштрафаваньне ўтойшчыкаў—лепшая гарантыя супроць далейшага ўтойваньня.

Прадстаўнікі ад сялянства і сельсаветчыкі ня прымаюць належных мер да поўнага высьвятленьня крыніц даходу. Часта за прадстаўнікоў абіраюцца моцныя сераднякі і яны ў камісіі маўчаць, як вады ў рот набраўшы. Заможны гаспадар, які трымае спецыяльна для возьніцтва некалькіх коняй, паказвае заработку 50-100 руб. Гэта лічба яму жывёлы ў хлявок моцных гаспадароў, дык старшыня аднаго сельсавету нечакана захварэў, хаця за гадзіну да гэтага быў здаровы.

У выніку гэткіх адносін да справы мы маем значнае ўтойваньне аб'ектаў абкладаньня, асабліва жывёлы і заработкаў. Найбольш буйное ўтойваньне—у моцных гаспадароў. Ёсьць сельсаветы, дзе (па падочных вестках) разьмер заработкаў павялічыўся ўдвойчы супроць леташняга, а падлік паказвае ўдвойчы менш. Сельсавет падводзіць вынікі падліку па сельсавеце і, ня гледзячы на значнае паменшаньне аб'ектаў сельска-гаспадарчага падатку, дасылае матар'ял у РВК, ня робячы ніякае праверкі.

Горш за ўсё, што значная частка раёнаў ставіць пытаньне так: наколькі да сельсавету прымацаваны ўпоўнаважаны РВК, дык можна чакаць канчатковых вынікаў. Практычна гэта азначае, што на ўвесь час падліку аб'ектаў сельска-гаспадарчага падатку па даным сельсавеце РВК ня ведае, што робіцца, і ня можа адразу напраўляць памылак, якія дапушчаюцца ў працэсе працы.

Становішча падрыхтоўчае працы па сельгаспадатку выклікае сур'ёзную трывогу. Трэба бездакладна ўтварыць пералом у гэтай справе. Больш за ўсё трэба паказаць сельсаветам на іх сапраўдную адказнасьць за вынікі падліку аб'ектаў абкладаньня. Цяганіну ў справе фактычнае праверкі трэба вынішчыць. Выбаркі па незямляробчых заработках павінны быць скончаны і дасланы сельсаветам у самы кароткі час. Раённыя выканаўчыя камітэты павінны дабіцца, каб упоўнаважаныя на справе, а не на паперы працавалі ў сельсаветах. Праверку працы трэба рабіць на ходу, а не пасьля таго, як яна скончана.

Інакш падлік аб'ектаў сельгаспадатку ня дасьць тых палітычных і бюджэтных вынікаў, якіх мы ад яго чакаем.

М. ПАЎЛАЎ.

2-ая Кастрычнікаўская канфэрэнцыя

Выбары раённага камітэту

Пасьля зацьверджаньня рэзалюцый па дакладах т. т. Славінскага і Конюхава, канфэрэнцыя прыступіла да выбараў кіруючага органу Кастрычнікаўскай арганізацыі КП(б)В раённага камітэту, рэвізыйнай камісіі райкому і парткіраўніцтва. У склад райкому персанальным галасаваньнем абрана 55 чалавек—42 члены і 13 кандыдатаў.

У члены райкому ўвайшлі т. т. Конюхаў, Мялешка, Капаевіч, Муляўка, Галубёў, Шнэйдэр, Вялікабрынскі Зінаў (рабочы дэпо МВБ чыгункі), Зьмітровіч (Вучкпрафсож МВБ чыгункі), Бачынга (рабочы службы шляху чыгункі), Бігэ (рабочы службы эксплёатацыі МВВ чыгункі), Раманаў (АБВШ), Штэйман (гарбарня «Бальшавік»), Эпштэйн (ВДУ), Златкін (Чырвоная армія), Іваноў (чыгунка), Пятрухін («Чырвоная Зара»), Сагаловіч (завод «Энэргія»), Лісоўскі (завод «Энэргія»), Альтман (Белсампрамсаюз), Шапіра (ДПУ), Амельчыц (чыгунка), Готліб (фабрыка абутку), Данілевіч (гута «Пралетары»), Абрамовіч (шчотачная фабрыка), Фрэйдзін («Бальшавік»), Гэльфман, Ёмец (ДПУ), Валковіч (ЦК КП(б)Б, Лазоўскі (ЦКК-РСІ), Валахнянскі («Энэргія»), Бутырскі (вагонныя майстэрні), Пашкова (завод «Чырвоная Зара»), Барашка (чыгунка), Чарны (фабрыка абутку), Мільнэр (ДПУ), Кавалёў, Кіналінскі, Шэрман (фабрыка абутку), Андрэеўская («Бальшавік»), Лапотка і Каранеўскі (БДУ).

У кандыдаты абраны т. т. Юргенсон (ДПУ), Васільлеў (Чырвоная армія), Рубін (сьпірт завод), Царык (рабфак), Васкабойнікаў (банкаўскія ўстановы), Каждан (шчотачная фабрыка), Хамілін (Чырвоная армія), Альпаровіч (МЦРК), Пімчыкаў («Энэргія»), Яршоў, Нароенка (Наркамюст), Пэсьцераў (варта чыгункі) і Губскі (ячэйка папраўчага дому).

У рэвізыйную камісію райкому абраны членамі т. т. Адзінцоў, Левін, Рэзьнікава, Кацнальсон і Грузінскі; кандыдатамі т. т. Камэйка і Матусэвіч.

Партыйная тройка складзена з т. т. Паўловіча, Міхайлава, Руссцкага (члены), Чэшка і Кузіна (кандыдаты).

Першы пленум Кастрычнікаўскага райкому

Пазаўчора адбыўся першы пленум нанава абранага Кастрычнікаўскага райкому КП(б)В, на якім было абрана бюро райкому і разьмеркаваны абавязкі паміж апошнімі.

У члены бюро райкому абраны т. т. Конюхаў, Галубёў, Капаевіч, Шнэйдэр, Муляўка, Штэйман Сагаловіч, Эпштэйн, Готліб, Зінаў, Іваноў, Зьмітровіч і Златкін.

Кандыдатамі ў члены бюро райкому абраны т. т. Шапіра, Фрэйдзін, Пятрухін, Мялешка і Данілевіч.

Сакратаром райкому абраны т. Конюхаў. Абавязкі паміж членамі бюро разьмеркаваны наступным чынам: загадчык АПА райкому—т. Капаевіч, заг. аргаддзелам—т. Галубёў, жанаддзелам—тав. Шнэйдэр.

Пачалыся перавыбары ў сельгаскаапэрацыі

Дзе працуюць групы беднаты

26-га мая адбыўся сход упоўнаважаных Шчарбацкага с.-г. крэдытнага таварыства (Магілёўскае акругі), на якім прысутнічала 78 проц. агульнага ліку ўпоўнаважаных.

Бядняцкая праслойка сходу складала 58 проц. і жаночая 10 проц. агульнай колькасьці прысутных.

Сход вельмі дружна абгаворваў усе пытаньні. Па справаздачным дакладу праўленьня і рэвіз. камісіі ўпоўнаважаныя задалі 26 запытаньняў і ў спрэчках выказалася 12 асоб.

Шматлікія спрэчкі і запытаньні мелі мэтай высьветліць правільнасьць скарыстаньня крэдыдаў, пэрспэктывы крэдытаваньня садаводзтва арнятрывалага будаўніцтва, становішча з насеньнем канюшыны, завозам жалеза і інш.

Кулацкая праслойка вёскі мела на сходзе двох сваіх прадстаўнікоў, праз якіх яна зрабіла спробу ўнесьці ў цеснае супрацоўніцтва беднаты і серадняцтва дэзарганізацыю пры выбарах новага складу рэвіз. камісіі.

Першы з гэтых падкулачнікаў (ня пайшчык т-ва і ня ўпоўнаважаны), выказваючыся супроць кандытатуры добра вядомага, усімі паважанага інваліда працы т. Пузырэйскага ў сваёй прамове панёс яму пэрсанальную абразу.

На гэта сход дружна адгукнуўся абурэньнем, і т. Пузырэйскі без далейшых супярэчнасьцяй быў абраны ў склад рэвіз. камісіі.

Другі падкулачнік таксама зрабіў спробу выказацца супроць кандыдатуры ў рэвіз. камісію сялянкі-батрачкі але і гэты ня сустрэў з боку прысутных ніякага падтрыманьня і сялянка-батрачка амаль аднагалосна прайшла ў склад рэвіз. камісіі.

Высунуты парт'яэйкай і групай беднаты спіс праўленьня ў складе пяці асоб, з якіх дзьве жанчыны, сход прыняў аднагалосна.

Так шчыльна бядняцка-серадняцкая група ўпоўнаважаных Шчарбацкага таварыства самкнула свае рады.

Б.

Справаздачная кампанія скончылася--пачынаюцца выбары

(МЕНШЧЫНА)

Справаздачна-перавыбарчая кампанія па с.-г. крэдытных таварыствах у Менскай акрузе пачалася 10-га мая з пастаноўкі справаздач крэдытных таварыстваў на сходах пайшчыкаў і з пераабраньнем складу ўпоўнаважаных 3 2-га па 30-га чэрвеня адбудуцца сходы ўпоўнаважаных і перавыбары кіруючых органаў—праўленьняў, саветаў і рэвізійных камісій. На гэтых сходах будуць абгаворваны важнейшыя пытаньні: справаздача праўленьня і судклады рэвіз. камісіі, даклады Менакрсельскрэдсаюзу аб яго рабоце і бліжэйшых задачах гаспадарчага будаўніцтва, аб павышэньні, прыцягненьні сялянскіх сродкаў і інш.

Кантрольным органам с.-г. крэдытных таварыстваў даны паказаньні ад дачы сапраўднай апэчкі работы праўленьняў таварыстваў, што практычна зроблена ў справе калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня і ўздыму ўраджайнасьці.

Але-ж гэта ня ўсё. Для таго, каб кампанію зрабіць сапраўды масавай, патрэбна прыцягнуць для ўдзелу ў ёй усю грамадзкасьць вёскі, наперад прапрацаваць прадвыбарчыя пытаньні на сходах і групах беднаты, узмацніць актыўнасьць беднаты, батрацтва, жанчын, моладзі і сялянства, зьвярнуць асаблівую ўвагу на вылучэньне лепшых з іх на кіруючую работу ў каапэратывах.

Трэба адзначыць, што ў мінулую кампанію сялянкі прымалі зусім слабы ўдзел (3,1 проц. да агульнага ліку пайшчыкаў зьявіліся на перавыбары). Гаварылі аб зусім слабым удзеле жанчын у справе каапэрацыйнага будаўніцтва. У гэтым годзе на падставе мінулай практыкі праведзены па ўсіх раёнах канфэрэнцыі жаноча-каапэрацыйнага актыву ўсіх відаў сыстэмы с.-г. і крэдытнай каапэрацыі. Трэба больш рашуча ўзяць курс на вылучэньне жанчын на пастаянную работу ў каапэрацыю.

У мінулым складзе выбарчых органаў зусім слаба быў прадстаўлены наш сацыялістычны сэктар: камуны, калгасы і вытворчыя каапэрацыйныя аб'яднаньні. Ня трэба шмат гаварыць аб тым, што гэтыя арганізацыі павінны мець сваіх прадстаўнікоў у праўленьнях с.-г. крэдытных таварыстваў.

Усю падрыхтоўчую работу да перавыбараў нізавой сыстэмы с.-г. крэдытнай каапэрацыі немагчыма будзе правесьці без належнай дапамогі з боку мясцовых, савецкіх і грамадзкіх арганізацый.

Трэба скарыстаць справаздачна-перавыбарчую кампанію для ўступленьня с.-г. крэдытных таварыстваў у спаборніцтва на лепшую пастаноўку работы ў таварыстве.

П—аў.

Добрае пачынаньне добрускіх інжынэраў і тэхнікаў

25-га мая адбыўся вечар змычкі паміж інжынэрна-тэхнічнымі працаўнікамі і вытворчым актывам Добрускай фабрыкі паперы «Гэрой працы» На вечары прысутнічала чалавек 20 інжынэраў і тэхнікаў і чалавек 80 рабочых-вынаходцаў і членаў вытворчых камісій.

Мэтай вечару было аформіць і ўзмацніць тое зьбліжэньне, якое пачалося паміж інжынэрна-тэхнічнымі працаўнікамі і рабочымі на базе сацыялістычнага спаборніцтва.

Да пачатку сацыялістычнага спаборніцтва паміж рабочымі - вынаходцамі, вытворчым актывам і тэхнічнымі працаўнікамі была амаль што глухая сьцяна. Гэта атрымалася ў сувязі з шматлікімі выпадкамі нячулых адносін некаторых інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў да прапаноў рабочых і вынаходцаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва ахапіла энтузіязмам і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, які пачаў аддаваць значна больш часу і энэргіі ўзмацненьню вытворчасьці. Гэта зблізіла рабочых і тэхнічны пэрсанал.

І вось інжынэры запрасілі рабочых на вечар змычкі, у часе якога інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі ў сваіх выступленьнях адзначылі памылкі з боку некаторых інжынэраў у мінулым і ўрачыста ўзялі на сябе абавязак зьмяніць свае адносіны да рабочых і ўзяць шэфства над вынаходцамі і ўдарнымі брыгадамі моладзі.

Рабочыя ў сваю чаргу адзначылі паслугі інжынэраў у спаборніцтве, і падкрэсьлівалі сваё жаданьне дружна працаваць з інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам.

Такім чынам, саюз аформлен. Трэба толькі, каб гэты саюз на практыцы, у рабоце, у вытворчасьці сябе праявіў, як належыць.

ШЭРЫ.

Спаборніцтва на чыгунцы яшчэ не разгарнулася

На пленуме белбюро саюзу чыгуначнікаў быў заслуханы даклад старшыні саюзу тав. Ісаева аб сацыялістычным спаборніцтве на чыгунцы.

Што зроблена? Па Менскім вучастку арганізавана адна вучастковая камісія для кіраваньня ўсёй работай. Пры ўсіх мясцкомах—у Менску, Барысаве і Негарэлым—арганізаваны мясцовыя камісіі. Для зарадкі на вытворчасьці ў Менску арганізаваны 4 брыгады рабочай моладзі.

Служба пуці ў Менску выклікала на спаборніцтва службу пуці ў Барысаве, менская таварная станцыя выклікала менскую пасажырскую станцыю, а станцыя Негарэлае—станцыю Себеж.

Па Жлобінскім вучастку арганізавана дзьве брыгады для кіраўніцтва спаборніцтвам. Выкліканы Гомель і сумежная дарога МВБ чыгункі.

У Воршы таксама арганізавана вучастковая камісія для агульнага кіраўніцтва, праведзена тэхнічная нарада па практычным правядзеньні спаборніцтва. Дэпо станцыі Воршы выклікала дэпо станцыі Раслаўль.

Вось усё. Трэба сказаць, што гэтага вельмі мала. Падліку дасягненьняў асобных ударных брыгад, майстэрань і г. д. у белбюро саюзу чыгуначнікаў няма. Таму невядома, ці ёсьць наогул якія-небудзь дасягненьні на сёньняшні дзень. Як выконваюцца дагаворы паміж асобнымі вучасткамі? Гэта таксама на пленуме ня высьветлена.

Чыгуначнікам трэба падцягнуцца, а белбюро чыгуначнікаў—узмацніць сваё кіраўніцтва спаборніцтвам.

У. Б.

Сацыялістычнае спаборніцтва

Прафсаюзы--у ролі глядача

ФАБЗАУКОМЫ, УЗМАЦНЯЙЦЕ КІРАУНІЦТВА СПАБОРНІЦТВАМ

Нарада швэйнікаў выявіла, што фабзаўкомы спаба кіруюць спаборніцтвам.- Штабы ня зьвязаны з вытворчымі камісіямі і нарадамі.—Спаборніцтва не адлюстроўваецца ў масавай культрабоце.—Адміністрацыя адмаўляецца вывешваць зводкі аб ходзе спаборніцтва.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ У ШВЭЙНІКАУ

Гэтымі днямі пры ЦП саюзу швэйнікаў адбылася нарада прадстаўнікоў швэйных фабрык па пытаньні аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва

Спаборніцтвы на швэйных прадпрыемствах пачаліся ў красавіку. Першы пэрыяд прайшоў у пошуках арганізацыйных форм, якія-б далі магчымасьць уцягнуць масы. На некаторых прадпрыемствах мясцовыя арганізацыі з гэтай работай ня справіліся, таму шмат дзе мы мелі скрыўленьні правільнай лініі ў правядзеньні спаборніцтва.

Напрыклад, на віцебскай фабрыцы «Прафінтэрн» мэты спаборніцтва ня былі належна растлумачаны рабочым. У захапленьні спаборніцтвам рабочыя ўзялі прадукцыйнасьць працы за кошт якасьці прадукцыі. Замест 390 піджакоў у дзень рабочыя выпусьцілі 460 піджакоў, але якасьць іх была ніжэйшая, чым трэба.

На фабрыцы Меншвэй таксама была праведзена нязначная растлумачальная работа. Таму ёсьць такія рабочыя на Меншвэі, якія лічаць спаборніцтва нейкім «манэўрам» для ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы. У зьвязку з спаборніцтвам амаль спынілі работу **групы рацыяналізатараў**, якія, наадварот, у гэты пэрыяд павінны **ўзмацніць сваю работу.**

На швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» у Віцебску пытаньне аб спаборніцтве ставілася не канкрэтна. Даклады і інфармацыі на агульных і цэхавых сходах насілі агітацыйны характар. Праўда, фабком быў заняты іншай работай: пераглядам норм, выбарамі цэхавых прафбюро, падрыхтоўкай да выбару фабкому і г. д.

Тут мы таксама сустракаемся **з вельмі бюракратычнымі адносінамі да спаборніцтва з боку адміністрацыі.** Самае важнае ў спаборніцтве—гэта **штодзённая інфармацыя рабочых аб ходзе спаборніцтва,** аб дасягненьнях і недахопах. Але адміністрацыя фабрыкі «Прафінтэрн» **адмовілася нават вывешваць зводкі аб ходзе спаборніцтва па цэхах.**

Больш-менш здавальняюча праведзена падрыхтоўчая работа **на Гомельскай фабрыцы «Камінтэрн».** Там нават на выклік «Прафінтэрну» не пасьпяшыліся в адказам, як робяць іншыя прадпрыемствы, а нарашылі лепш падрыхтаваўшы да спаборніцтва, а потым ужо паслаць свой адказ. Гэтая падрыхтоўка дала значныя вынікі. У красавіку прагулаў было 600 гадзін, а за 15 дзён мая—толькі 80 гадзін. Фабрыка перайшла на работу, пачынаючы з 6-ці гадзін раніцы, што дае штодзенна 65 руб. эканоміі і г. д.

Слаба зьвязаны з спаборніцтвам вытворчыя камісіі і нарады. Працуюць штабы, тройкі, а вытворчыя камісіі і нарады быццам стаяць у баку.

Вялікім недахопам зьяўляецца тое, што спаборніцтва **не адлюстроўваецца ў масавай культрабоце.** Слабы ўдзел прымаюць у спаборніцтве насьцянныя і друкаваныя газэты.

З боку ЦП саюзу амаль ня было ніякіх дырэктыў, як павінны працаваць штабы спаборніцтва, якое павінна быць кіраўніцтва з боку фабкому. ЦП лічыла, што штабы кіраўніцтва самі павінны знайсьці формы і мэтады работы.

* * *

Нарада прыняла рад прапаноў па ўзмацненьні сацыялістычнага спаборніцтва. Усім **фабкомам прапанавана** правесьці больш шырокую растлумачальную работу аб значэньні спаборніцтва, папулярызаваць заключаныя дагаворы паміж прадпрыемствамі, часьцей і рэгулярна інфармаваць рабочых аб ступені выкананьня дагавораў.

Фабкомы павінны дабіцца, **каб работа штабаў па кіраўніцтве спаборніцтвам была ўвязана з работай вытворчых камісій і нарад,** а таксама **з групамі рацыяналізатараў** ячэек камсамолу. Шырэй разгарнуць спаборніцтва паміж цэхамі і зьмянамі, прычым у дагаворах павінны азначацца канкрэтныя мэты і тэрміны спаборніцтва.

Па цэхах павінны быць створаны цэхавыя тройкі па садзейнічаньні і наглядзе за выкананьнем дагавораў. Усю культработу на бліжэйшы пэрыяд (чаму толькі на бліжэйшы пэрыяд?—**П.**) паставіць пад кутом погляду растлумачэньня задач сацыялістычнага спаборніцтва шляхам правядзеньня спэцыяльных гутарак, вечароў пытаньняў і адказаў, арганізацыі паказальных судоў над злоснымі парушыцелямі дагавораў.

Фабрычныя газэты павінны стварыць спэцыяльны аддзел для асьвятленьня ходу выкананьня дагавораў.

Фабкомы павінны сыстэматычна на сваіх пасяджэньнях заслухоўваць інфармацыі вытворчых камісій і штабаў, даючы канкрэтныя дырэктывы аб іх далейшай рабоце.

Адзначаючы выпадкі нежаданьня адміністрацыі вывешваць у цэхах зводкі аб ходзе спаборніцтва, нарада зьвярнулася з хадайніцтвам у трэст, каб ён безадкладна абавязаў дырэктароў фабрык прадстаўляць штабам усе неабходныя матар'ялы і вывешваць зводкі па цэхах. Таксама нарада зьвярнулася з просьбай у трэст, каб ён даў указаньні дырэктарам **аб выдзяленьні спэцыяльных сум для прэміяваньня цэхаў, груп і асобных рабочых, якія добра выканаюць узятыя на сябе абавязкі па дагаворы.**

П.,

НЯ КІДАЙЦЕ СЛОЎ НА ВЕЦЕР

ПАРАДНЫЯ ВЫКЛІКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ РЭЗКА АСУДЖАНЫ

Многім хочацца паказаць, што і яны «ня лыкам шыты». Усе выклікаюць на сацыялістычнае спаборніцтва—і яны выклікаюць. А чаго хочуць—і самі ня ведаюць.

Мы ўжо адзначалі, што ўмовы спаборніцтва павінны быць **строга канкрэтнымі,** і выкананьне іх павінна абмяжоўвацца **пэўным тэрмінам.** Калі-ж умовы фармулююцца ў агульных выразах без паказаньня тэрмінаў выкананьня, тады выклік зводзіцца да нуля.

Вось, напрыклад, Наркамфін Беларусі **«разразился»** цэлым градам выклікаў па ўсіх напрамках СССР. Выклікі пасланы і Наркамфіну УССР, і Наркамфіну Узбэкскай ССР, і калектыву Наркамзему Беларусі і шмат іншым. Ужо адно тое, што Наркамфін Беларусі выклікае не адзін калектыў, а шмат, кажа аб тым, што Наркамфін падыйшоў да справы вельмі пясур'ёзна. Якія-ж умовы спаборніцтва высоўвае Наркамфін БССР?

1. Максымальнае скарачэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў.

2. Увядзеньне да 1-Х 29 г. найбольш рацыянальнай сыстэмы справаводзтва.

3. Узьняцьце працоўнай дысцыпліны і інтэнсыўнасьці работы.

Вось прыблізна ўсё тое, што ў розных варыянтах Наркамфін БССР прапанаваў сваім «працаўнікам». Што канкрэтнага ў гэтых прапановах? **Абсалютна нічога.** Што значыць «максымальнае скарачэньне»? Адна ўстанова можа зразумець гэта, як адзін процант, а другая, як 20, трэцяя, як 30 і г. д. А наколькі лічыць патрэбным скараціць НКФ БССР? Невядома. Таксама невядома, у **які тэрмін** павінны быць скарочаны выдаткі. Тое-ж самае наконт іншых двух пунктаў. Ніводнай лічбы, ніводнага канкрэтнага факту!

Мы больш падрабязна спыніліся на аднэй установе. Але той-жа малюнак мы маем амаль на ўсіх іншых установах, якія «ўступілі» ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Акрэднадзелы выклікалі адзін аднаго. Але канкрэтных прапаноў яны амаль ня высунулі. Тое-ж самае датычыць акрстаддзелаў, кас ашчаднасьці, студэнцтва і г. д. Усе гэтыя ўстановы і арганізацыі толькі кідаюць словы на вецер, займаюцца пустазвонствам, шумяць, адным словам актыўна праводзяць... **парадная спаборніцтва,** супроць якога папярэдзіў ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове.

Некаторыя арганізацыі лічаць неабходным **падагнаць** свае калектывы. Вось, напрыклад, прафсюм мэдфаку БДУ абвясьціў сацыялістычнае спаборніцтва, не паставіўшы спачатку гэтага пытаньня на агульным сходзе студэнцтва.

Фабрыка «Гэрой Працы» выклікала на спаборніцтва сваю падшэфную чырвонаармейскую часьць. Ставіцца пытаньне: у якой галіне гэтыя дзьве розныя арганізацыі могуць паставіць сабе адналькавыя мэты? Фабрыка ўзьнімае прадукцыйнасьць працы на пэўны процант, а на які процант чырвонаармейцы ўзьнімуць сваю баяздольнасьць? Ці ня зводзіцца гэты выклік да параднага выкліку?

Наогул, у выкліках на спаборніцтва ёсьць шмат непрадуманага. Правільна ставячы пытаньне, што **трэба абавязкова прыняць удзел у спаборніцтве,** шмат якія арганізацыі і ўстановы бяз грунтоўнай папярэдняй падрыхтоўкі, а толькі абмеркаваўшы гэтае пытаньне ў габінэце, не падумаўшы наконт канкрэтных аб'ектаў спаборніцтва, робяць выклікі «ўсім, усім, усім і на гэтым супакойваюцца.

Гэтым установам і арганізацыям трэба сказаць—«ня кідайце слоў на вецер». Больш дзелавітасьці і сур'ёзнага падыходу да гэтай важнейшай справы нашай сучаснасьці.

Д.

Дагавор фанэрных заводаў

25-га мая на фанэрны завод **«Зьвязда» (Мазыр)** прыбыла дэлегацыя, у ліку 4-х чалавек ад Дарніцкага фанэрнага заводу (Украіна). Рабочыя з вялікай радасьцю прынялі дэлегацыю.

Перад пачаткам агульнага сходу рабочых было склікана аб'яднанае пасяджэньне з прадстаўнікоў заводу «Зьвязда» і заводу Дарніцы. Паміж абодвума прадстаўніцтвамі завязаліся вялікія спрэчкі: Дарніцкая дэлегацыя не вагаджалася з высунутымі ўмовамі рабочымі «Зьвязды». Спрэчкі былі перанесены на агульны сход рабочых і там рабочыя спэцыялістыя, добра падлічыўшы, колькі можа Дарніцкі завод выпрацаваць прадукцыі, заявілі: «Умовы Дарніцкага заводу даюць поўную магчымасьць (пры 5 шэпльмашынах) давесьці сваю выпрацоўку да 14.000 куб. мэтраў, давесьці процант экспарту да 55, зусім зьнішчыць глум на заводзе».

Дарніцкая дэлегацыя ўсё ўніралася, запэўнівала ўсіх, што яны ўзялі максымальныя лічбы, але... агульны сход рабочых пастанавіў: «даручыць дэлегацыі, якая абіраецца намі для паездкі ў Дарніцы, дабіцца ўключэньня ў праграму Дарніцкага заводу давядзеньне выпрацоўкі фанэры з 12.700 да 14.000 куб. мэтраў, выпрацоўку экспарту да 55 проц., процант глуму давесьці да нуля».

Рабочыя-ж «Зьвязды» на сябе ўзялі абавязак выпусьціць (пры 3-хзьменнай рабоце) 17.112 куб. мэтраў фанэры, падняць гатунковасьць прадукцыі да 80 проц., што дасьць выхад экспарту ў 55 проц.; прадукцыйнасьць працы падняць на 17 проц., зусім зьнішчыць прагулы і глум, зьнізіць сабекошт прадукцыі на 7 проц., адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі на 20 проц.

Такі дагавор падпісалі рабочыя «Зьвязды» і з такім настроем накіравалася дэлегацыя ў Дарніцу, каб паказаць рабочым Дарніцы магчымасьць выкананьня дагавору.

Б. Ш.

Па Савецкай Беларусі

ПОЎНЫМ ХОДАМ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У акрузе пачалася справаздачна-перавыбарчая кампанія па ўсіх відах с.-г. каапэрацыі. Для арганізацыі і правядзеньня кампаніі ў раёны акругі камандзіраваны ўпоўнаважаныя Палессельсаюзу.

У Гомелі ужо праведзена акруговая канфэрэнцыя жанчын, на якой быў заслуханы даклады Палессельсаюзу, Малочсаюзу і Калгассаюзу. Па раёнах праведзены канфэрэнцыі каапэратыйнага актыву, на якіх абгаворваны пытаньні ўдзелу ж

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПОЛЬСКАГА ВЯСКОВАГА АКТЫВУ

Нарада польскага вясковага актыву праходзіць пры актыўным удзеле ўсіх дэлегатаў.

У спрачках па дакладу тав. Чарвякова аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР прымала ўдзел каля 20 чалавек.

Выказаліся т. т. Шчэрба (Магілеў), Урублеўскі (Бабруйск), Казлоўскі (Гомель), Казарскі (Мазыр), Тамашэўскі (Гомель), Абрамовіч (Мазыр), Радкевіч (Мазыр), Пятроўская (Менск), Яновіч (Менск), Невяроўскі (Бабруйск), Гарбатоўскі (Мазыр) і інш.

Дэлегаты ў сваіх выступленьнях указваюць, што, толькі дзякуючы савецкай уладзе, працоўныя палякі і ўсе нацыянальнасьці, якія насяляюць Савецкую Беларусь, атрымалі магчымасьць свабодна будаваць сваю будучыню.

— Нам, вясковым актывістым,—кажа тав. Шчэрба,—прыходзіцца ў сваёй рабоце вытрымліваць шалёнае супраціўленьне кулакоў і клерыкалаў. У некаторых мясцох агітацыя кулакоў супроць калектывізацыі дала нават некаторыя вынікі. У Магілёўскай акрузе, дзякуючы агітацыі кулацкіх элемэнтаў, разбураецца калгас, які быў нядаўна арганізаваны. Кулакі гаворыць калгасьнікам: «Бальшавікі гоняць вас у паншчыну, яны забяруць для сябе ўсе вашы прыбыткі».

Тав. Шэраль (Мазыршчына) гаворыць аб тым, што вёска гаспадарча і культурна расьце. У 1918 годзе некаторыя вёскі Мазыршчыны карысталіся толькі сахою. Сяляне ня ведалі нават, што такое агранамія. Цяпер маюцца аграномы. Насельніцтва вельмі зацікаўлена ва ўзьнаўленьні ўраджайнасьці, гадуе жывёлу. Вёска імкнецца перайсьці на шматпольле.

Некаторыя дэлегаты заклікалі працоўных палякаў прымаць актыўны ўдзел у ажыцьцяўленьні пяцігодкі народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі.

Агульная думка ўсіх выступаўшых—трэба ўзмацніць наступленьне на капіталістычныя элемэнты вёскі. Трэба ўзмацніць работу сярод беднаты.

3-га чэрвеня ўвечары тав. Чарвякоў выступіў з заключным словам на польскай мове.

4-га чэрвеня нарада заслухала даклад тав. Бэнэка аб чарговых задачах рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

За культурную дарогу і аўтамабіль

Аўтадор за паўтары гады працы здолеў пусьціць некаторыя карані ў глыб—у самае насельніцтва, у вёску, на прадпрыемствы.

У „тыдзень", які сёньня пачынаецца, Аўтадор павінен паказаць сваю здольнасьць падняць вырокія масы і мабілізаваць іх вакол задач тыдню Аўтадору, асабліва тых мерапрыемстваў, якія зьвязаны канкрэтна з дарожнай і аўтамабільнай справай.

Самае важнае і актуальнае—абавязкова палажыць пачатак правядзеньню закону аб гужпрацяваўнасьці насельніцтва і ставраньні такіх тэхнічных і арганізацыйных магчымасьцяй, якія-б увайшлі ў баланс нашага дарожнага і маставога палянішчэньня.

Няма патрэбы гаварыць пра значэньне, якое мае для пасьляховага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва,для наладжваньня правільнай арганізацыі гандлёвага абароту краіны, рэканструкцыя і рацыяналізацыя груза-транспартнага руху.

Народная гаспадарка доўга яшчэ будзе карыстацца дарожна-транспартнымі сродкамі, як-бы ўтка па разьвівалася сучасная авіяцыя. Аўтатранспартны рух зьяўляецца цяпер адзінай трывалай эканамічнай гандлёвай сувязю паміж прамысловасьцю, якая хутка разьвіваецца, і сельскай гаспадаркай, якая так актыўна ўздымаецца.

Як і ва ўсіх іншых пытаньнях разьвіцьця народнай гаспадаркі, так і ў гэтым пытаньні нам не абмінуць клясавай барацьбы. Клясавы вораг—кулак, як прадстаўнік капіталістычнага сэктару ў вёсцы, праявіць ня меншае супраціўленьне супроць мерапрыемстваў па правядзеньні закону аб гужпрацяваўнасьці, чым ён праяўляе пры ажыцьцяўленьні ўсіх іншых пытаньняў разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. Арганізатары тыдню Аўтадору,ячэйкі Аўтадору, мясцовыя дзяржаўныя і грамадзкія арганізацыі павінны быць падрыхтаваны да таго, каб даць належны адпор клясаваму ворагу пры дапамозе бяднякоў-серадняцкай часткі сялянства.

Кожны кілёмэтр адрамантаванай або пабудаванай дарогі, кожны новы мост, кожнае аўто ёсьць ня толькі крок уперад да стварэньня культурнай дарогі ці павялічэньня аўтаруху, але і да ажыцьцяўленьня пяцігодкі, да вялікага сацыялістычнага наступленьня на прыватна-капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі.

М. Карклін.

У прэзыдыуме ЦВК БССР

Вынікі праверкі сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў

Згодна пакуль што ня поўных даных, якія ёсьць у Цэнтральнай Выбарчай Камісіі, значнага павялічэньня процанту пазбаўленых выбарчых правоў у параўнаньні з мінулай кампаніяй у БССР няма. Напрыклад, па сельскіх мясцовасьцях у 1926-27 г. было пазбаўлена выбарчых правоў 1,4 проц., у гэтую кампанію—1,8 проц.; па местачковых саветах—14 проц., зараз—14,8 проц.; па гарсаветах неакруговых гарадоў у 1926-27 г.—12,8 проц., зараз—13,9 проц.; па 5 гарсаветах акруговых гарадоў—у мінулай кампаніі—8 проц., зараз—9,1 проц.

Але калі ўзяць лічбы па паасобных раёнах, то ў некаторых выпадках заўважваюцца значныя хістаньні. (Рэчыцкі раён—у 1926-27 г. пазбаўлена выбарчых правоў—231 чал., зараз 880 і інш.).

Нагляд з боку вышэйшых выбарчых камісій над ніжэйшымі ў справе пазбаўленьня выбарчых правоў характарызуецца наступнымі данымі (няпоўнымі): у раённыя выбарчыя камісіі паступіла скаргаў на пастановы сельскіх камісій 3.038, з іх здаволена 605; у акруговыя камісіі—3.346 скарг, з іх здаволена 558; у Цэнтральную Выбарчую Камісію паступіла 1.117 заяў, з якіх канчаткова вырашана 245 і з ліку апошніх здаволена 92. Усе іншыя заявы накіраваны ў акругі часткова для дачы заключэньня, а часткова на канчатковае вырашэньне. Ня ўсе акругі аднолькава добра аднесьліся да праверкі сьпісаў пазбаўленых выбарчых правоў у адпаведнасьці з дырэктывамі Прэзыдыуму ЦВК БССР. Добра правяла працу Мазырская акруга. Нічога ня зроблена па паўторнай праверцы ў Бабруйскай акрузе. У выніку паўторнай праверкі шмат асоб адноўлена ў выбарчых правах, ёсьць гэксама і выпадкі новага пазбаўленьня выбарчых правоў тых асоб, якім раней памылкова былі прадстаўлены выбарчыя правы (так, па Мазырскай акрузе адноўлена 287 асоб, пазбаўлена дадаткова 19; у Магілёўскай акрузе адноўлена 268 і пазбаўлена новых 19 асоб; у Полацкай—адноўлена 168, у Аршанскай—179 і г. д.). Цэнтральная Выбарчай Камісіяй у працэсе праверкі сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, заўважаны выпадкі беспадстаўнага пазбаўленьня выбарчых правоў з яўным парушэньнем Інструкцыі аб выбарах у Саветы. Гэтыя памылкі па меры іх выяўленьня выпраўляліся.

Па Менскай акрузе пазбаўлена выбарчага права 17.436 асоб, у тым ліку ў горадзе Менску 6.381 асоба. Менскай акруговай выбарчай камісіяй зараз правядзіцца паўторная праверка правільнасьці пазбаўленьня выбарчых правоў. Акруговая камісія паладзіла рад выездаў у тыя месцы, дзе ёсьць вялікі процант пазбаўленых выбарчых правоў.

Выступаўшыя члены Прэзыдыуму ЦВК падкрэсьлівалі вялікае палітычнае значэньне, якое мае праверка правільнасьці пазбаўленьня выбарчых правоў і ўказвалі на неабходнасьць далейшай дакладнай праверкі ўсіх сьпісаў пазбаўленых выбарчых правоў і кожнай скаргі паасобку.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанавіў: прызнаць, што масавага праяўленьня памылак у справе пазбаўленьня выбарчых правоў у БССР не наглядаецца, але разам з гэтым ёсьць выпадкі недастаткова ўважлівых адносін да справы пазбаўленьня выбарчых правоў як у сэнсе пазбаўленьня, так і ў сэнсе пазбаўленьня тых, якія павінны быць пазбаўлены; прадпісаць установы тэрмін паўторнай праверкі яшчэ на 1 месяц; абавязаць акрыканкомы пад адказнасьць старшынь падаць сваечасова Цэнтральнай Выбарчай Камісіі неабходныя матар'ялы.

Аб'яднаная ячэйка КП(б)Б і калектывы Белдзяржсьпірту і Белхарчтрэсту выказваюць глыбокае спачуваньне сям'і памёршага старога бальшавіка

тав. КРАСОЎСКАГА Ігната Іванавіча,

дарагога нам таварыша і кіраўніка нашага прадпрыемства.

МЕНСК

Пачынаецца чыстка савецкага апарату

Калегія Менскай акр. РСІ вылучыла акруговую кіруючую камісію па чыстцы савецкага апарату і камісіі па чыстцы апарату Акростатбюро і Біржы працы.

Старшынёй акруговай кіруючай камісіі па чыстцы апарату назначаны—т. ДАМБРОЎСКІ, нам. старшыні—т. ЖУКОВІЧ. У члены кіруючай камісіі вылучаны т.т. ДЗЕЖЫЦ, ПОЗЬНЯК (ад АКР.РСІ), ІСАЕЎ, КАВАЛЁЎ (ад ЦСПСБ), ЗЫСЬМАН, РОЗЭНБЛЮМ (ад пракуратуры), МАТУСЭВІЧ (рабочы шавецкай майстэрні Гандальбуду) і ЛІЎШЫЦ (рабочы—Эльводу).

Старшынёй камісіі ПА ЧЫСТЦЫ БІРЖЫ ПРАЦЫ назначана т. РУБІНА, членамі—т.т. Латануроскі, Ліманскі, Самойлаў, Воскі (рабочы заводу «Камунар») і Загорскі (рабочы дзяржрукарні).

Камісія па чыстцы апарату АКРСТАТБЮРО складзена з таварышоў: Корфа (старшыня), Шастакова, Барэнбаўма, Альтшулера Ф. (рабочы заводу «Камунар») і Александровіча (рабочы дзяржрукарні).

3-х дзёньнік па барацьбе з сухотамі

Наркамат аховы здароўя па прыкладу мінулых год наладжвае 20-22 чэрвеня 3-х дзёньнік па барацьбе з сухотамі. На мясцох утвараюцца акруговыя камісіі па правядзеньні 3-х дзёньніку. У часе 3-х дзёньніку на прадпрыемствах будуць наладжвацца даклады аб рабоце дыспансэраў, а таксама агляд гэтых дыспансэраў.

Адначасова мясцом запрапанавана прыняць практычныя крокі да арганізацыі сухотных ложкаў пры акруговых больніцах і дзіцячых пляцовак пры сухотных дыспансэрах. Намечана арганізацыя скарбоначных збораў. Да правядзеньня 3-х дзеньніка будуць прыцягнуты грамадзкія арганізацыі.

Беларускія мастакі—у калгасы і індустрыяльныя цэнтры

У бліжэйшыя дні каля 12 мастакоў—членаў Беларускай асацыяцыі рэвалюцыйных мастакоў разьяжджаюцца па індустрыяльных цэнтрах і калгасах БССР для зьбіраньня матар'ялаў да вядыходзячай увосень усебеларускай выстаўкі рэвалюцыйных мастакоў. Для арганізацыі выстаўкі мяркуецца атрымаць адпаведныя сродкі ад ураду.

Выключэньне нягодных дэпутатаў

Мандатная камісія пастанавіла выключыць з складу гарадзкога савету Сачка—за злачынства па службе і Кецко—за антысэмітызм і пратэкцыянізм. Прэзыдыум гарсавету даручыў мандатнай камісіі перадаць пытаньне аб адкліканьні гэтых дэпутатаў агульным сходам выбаршчыкаў.

10 тысяч рублёў у карысьць ахвяр сацыял-фашызму

Учора ЦК МОПР'у БССР перавёў у ЦК МОПР СССР 15 тысяч рублёў, у тым ліку першы ўзнос у 10 тысяч рублёў на дапамогу ахвярам сацыял-фашызму ў дні Першага Мая ў Нямеччыне і іншых буржуазных краінах.

З паказанай сумы 7 тысяч рублёў дала Менская акруга. Грошы сабраны сярод працоўных па падпісных лістох, ад канцэрту МОПР'у, ад нядзельнікаў і г. д.

Новыя аўтабусныя лініі

У зьвязку з каналізацыйнымі работамі на цэнтральных вуліцах гораду, устаноўлены і рух аўтабусаў па наступных лініях і вуліцах. **Вакзал—МББ ч.—Камароўка.** Па гэтай лініі аўтабусы праходзяць вуліцы: вакзал МББч.—Савецкая—Валадарскага—Карла Маркса—Энгельса—Пляц Волі — Мопраўскую—Шпітальную—Савецкую да Камароўкі.

Лінія Серабранка—Старажоўка. Аўтабусы праходзяць па вуліцах: Пасажырскі вакзал—Віленскі рынак—Карла Маркса—Энгэльса—Пляц Волі—Нізкі Рынак—Камунальная—Старажоўка.

З 2-га чэрвеня будуць хадзіць аўтабусы па лініі Менск—Полацк. Адпраўленьне штодзенна а 7 гадз. раніцы.

Менск—Магілеў адпраўленьне праз дзень а 7 гадз. раніцы. У працягу чэрвеня аўтабусы на Магілеў будуць адпраўляцца па чотных чыслах.

Менск—Слуцак: праз Самахвалавічы-Узду—Капыль, Цімкавічы, Адпраўленьне праз дзень па чотных чыслах а 7 гадз. раніцы.

Дадатковыя аўтабусы **Менск-Чэрвень.** Адпраўленьне штодзенна а 7 гадз. увечары.

Дадатковыя аўтабусы **Менск—Лагойск.** Адпраўленьне штодзенна а 8 гадз. увечары.

Менск-Дразды. Адпраўленьне штодзенна а 8 гадз. раніцы і 5 гадз. дня.

Абавязковае лячэньне вэнэрычных хвароб

У Менску адбылася Усебеларуская нарада працаўнікоў па вэнэрычных хваробах і хваробах скуры.

За час існаваньня савецкай улады ў Беларусі ёсьць вялікія дасягненьні ў барацьбе з гэтымі хваробамі. У Менску арганізавана катэдра і клініка з стацыянарам па вэнэрычных хваробах і хваробах скуры. Створана сетка з 13 дыспансэраў і вэнпунктаў, адчынены спэцыяльныя аддзяленьні і фавозныя лячэбніцы. Пачата барацьба з вайчанкай.

Нарада намецілa рад практычных мерапрыемстваў па далейшай барацьбе з гэтымі хваробамі.

Наркамату Аховы Здароўя даручана распрацаваць і ўнесьці ў СНК праект дэкрэту аб абавязковасьці лячэньня вэнэрычных хвароб, а таксама ўвесьці абавязковасьць рэгістрацыі вэнэрычных хвароб як у мэдсанітарных установах, так і ў прыватных габінэтах.

Нарада выказалася таксама за арганізацыю для хворых вайчанкай рэспубліканскага люпазорыю. Уся праца па барацьбе з грыбковымі захворваньнямі павінна быць сканцэнтравана ў вэнэрычных дыспансэрах.

У мэтах узмацненьня барацьбы з вэнэрычнымі захворваньнямі ў Гомелі прызнана патрэбным перавод вэнэролёгічнай больніцы з Рэчыцы ў Гомель і застаўленьня ў Рэчыцы на больш 10 ложкаў.

Па дакладу доктара ЯБЛЕНІКА аб барацьбе з ганэрэяй нарада выказалася за тое, каб пяцігодкай Наркамату Аховы здароўя было прадугледжана адкрыцьцё ў больніцах ганарэйных ложкаў у першую чаргу для жанчын. Прызнана таксама мэтавагодным арганізацыя працоўнага прафілянторыю.

Да ўсіх арганізацый МОПР БССР

Цэнтральны камітэт МОПР БССР просіць усе арганізацыі МОПР і іншыя грамадзкія арганізацыі грошы, якія зьбіраюцца ў карысьць ахвяр сацыял-фашызму не затрымліваць, а безадкладна пераводзіць па прызначэньні ў адпаведныя райкомы і акругкомы МОПР'у.

Выстаўка украінскага мастацтва ў Менску

Беларуская асацыяцыя рэвалюцыйных мастакоў скончыла перагаворы з асацыяцыяй рэвалюцыйных мастакоў Украіны аб арганізацыі ў Менску выстаўкі украінскага мастацтва. У выстаўцы прымуць таксама ўдзел члены асацыяцыі рэвалюцыйных архітэктараў Украіны. Выстаўку мяркуецца адкрыць увосень. На ёй выставяць свае работы каля 40 мастакоў і архітэктараў Украіны.

На Біржы працы

Усе беспрацоўныя краўцы павінны асабіста зьявіцца на Біржу працы (Разумовая сэкцыя) ў працягу 7, 8 і 10 чэрвеня між 8-ю і 1-ю гадз. дня для дачы аб сабе вестак, пры чым кожны беспрацоўны кравец павінен даставіць дакументы аб стажы працы па найме, кваліфікацыі і сямейным становішчы.

Хто не зьявіцца ў паказаныя дні, той будзе зьняты з вучоту.

За дзень

ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА. У садзе Наркамфіну адкрыта пляцоўка для дзяцей працаўнікоў Мен. ЦРК і Наркамфіну—на 75 чалавек.

РАМОНТ ШКОЛ. Адпушчана 30 тысяч рублёў на рамонт гарадзкіх школ. Найбольш буйны рамонт будзе зроблены ў школах № № 3, 7, 10.

СКАНЧЭНЬНЕ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ. 15-га чэрвеня канчаецца навучальны год ва ўсіх менскіх школах. Малодшыя групы школ паступова ўжо канчаюць заняткі. У сучасны момант інспэкцыя народнай асьветы занята падвядзеньнем вынікаў навучальнага году.

САВЕЦКІЯ СЛУЖАЧЫЯ—ВЁСЦЫ. Прэзыдыум ЦП саюзу саўгандальслужачых азнаёміўся з работай брыгады групкому ВМС, якая выяжджала ў вёску. Брыгада прабыла на вёсцы тыдзень і за гэты час адрамантавала 30 плугоў, 35 барон і 60 штук рознага інвэнтару.

ПЛЕНУМ АКРВЫКАНКОМУ. На 20-е чэрвеня ў Менску склікаецца чарговы пленум акрвыканкому. Пленум абгаворыць дырэктывы па складаньні бюджэту і кантрольныя лічбы на 1929-30 год, аб масавай працы саветаў, вынікі веснавой пасеўкампаніі, будзе таксама стаяць даклад аб падрыхтоўцы да асеннай пасеўкампаніі і інш.

****

Водгукі на заметкі

Скідкі атрымала беднота

У «Зьвязьдзе» ад 26-XII 28 года была зьмешчана заметка «Скідка... куланам» у якой зазначалася, што ў в. Ракаўцы (Барысаўскі р-н) скідкі па сельгаспадатку атрымалі выключна кулакі і заможнікі. Праведзеным расьледваньнем (Барысаўск. РВК) высьветлілася, што заметка не адпавядае сапраўднасьці, што, на адварот, скідкі атрымала беднота.

НАСЕННАЯ БУЛЬБА СКАРЫСТОЎВАЕЦЦА ПА ПРЫЗНАЧАЎНЬНІ

У газ. «Зьвязда» № 83 быў зьмешчаны артыкул «Горацкі райвыканком ня цікавіцца падрыхтоўкай да сяўбы, у якім, між іншым, зазначалася, што ў саўгасе імя Леніна, Аршанскай акругі, кормяць сьвіней насеньнем гатункавай бульбы. Па высьвятленьні гэтай справы аказалася, што ў саўгасе запраўдны кормяць сьвіней бульбай, але не насеннай, а дробнай, якая засталася ад пераборкі насеннай бульбы, і сялянскай, якая была куплена для броварэ і часткова папсавалася марозамі.

Бульба, прызначаная для насеньня ў колькасьці 11.000 пудоў, скарыстоўваецца па прызначэньні.

Ігнат Іванавіч Красоўскі

2-га чэрвеня г. г. у Маскве на Курскім вакзале памёр І. І. Красоўскі, які ехаў з Крыму, дзе ён лячыўся ад туберкулёзу.

Хто такі І. І. Красоўскі?—Гэта рабочы-каваль заводу «Проводник» у г. Рыгве. Уступіў у члены партыі ў 1909 г., з 1912 году па выбары рабочых працаваў старшынёю больнічнай касы.

У пачатку 1913 г. т. Красоўскі быў арыштаваны за палітычную дзейнасьць і сасланы з Прыбалтыкі на Урал. У 1916 г. быў высланы з Уралу ў 24 гадзіны за сьвяткаваньне 9-га студзеня. З Уралу выехаў у Ніжні Ноўгарад, дзе паступіў працаваць на завод «Отто Эрбе» і быў абраны ў Канавінскую агульна-больнічную касу, працуючы ў ёй да рэвалюцыі. З першага-ж дня рэвалюцыі быў членам савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў і з Кастрычнікавай рэвалюцыі быў членам прэзыдыуму Ніжагародзкага губвыканкому.

1-га студзеня 1919 г. т. Красоўскі ЦК КП(б) быў мабілізаваны ў Літву і Беларусь, як ведаючы літоўскую, польскую і латыскую мовы, пасьля чаго быў членам ЦПК Літбелрэспублікі і членам калегіі Наркамправы Літбелрэспублікі. Пасьля заняцьця белагвардзейцамі Літвы і Беларусі ЦК РКП быў адкліканы і для папраўленьня здароўя накіраваны на работу ў Н.-Ноўгарад, там быў абраны ў члены губвыканкому і назначаны начальнікам Ніжагародзкага губваку, дзе прапрацаваў да 19-га ліпеня 1921 г.

У апошні час І. І. Красоўскі працаваў у якасьці дырэктара Белдзяржсьпірту. Знаходзячыся ў партыі 20 год, І. І. Красоўскі актыўна ўдзельнічаў у партыйнай рэвалюцыйнай рабоце.

І. І. быў лепшым членам нашай партыі, лепшым таварышом. Ён умеў цаніць таварышоў. І. І. Красоўскі вызначаўся сваёй прастатой. Прабыў у партыі 20 год і вёў увесь час правільную і вытрыманую большавіцкую ленінскую лінію. За І. І. Красоўскім ня было ніколі заўважана, каб ён пры крутых паваротах, пры труднасьцях зьбіваўся з большавіцкай лініі.

Са сьмерцю І. І. КП(б)Б страціла лепшага свайго члена, старога падпольнага бальшавіка. Калі І. І. захварэў на сухоты яшчэ ў 1917 годзе і калі яго здароўе в кожным месяцам пагоршвалася, яму многія таварышы раілі перайсьці на пэнсію, але І. І. і слухаць не хацеў. Ён гаварыў адно, што ён павінен працаваць, раз у яго ёсьць хаця 10 проц. працаздольнасьці, што і іх ён павінен аддаць на справу ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту. І. І. Красоўскі памёр на 48-м годзе свайго жыцьця.

Сьці спакойна, дарагі таварыш Ігнат Іванавіч!

І. П. РЫЖОЎ.

Памяці таварыша Ігната Красоўскага

Бязьлітасная сьмерць вырвала з бальшавіцкіх радоў шчырага старога бальшавіка-рэвалюцыянэра.

Тав. Красоўскі знаходзіўся ў радох бальшавіцкае партыі з 1909 году і у прафэсіянальным руху з 1910 году. Гады буржуазнага панаваньня і рэакцыі, арышты, турмы не зламалі сілу і волю тав. Красоўскага ў яго барацьбе з эксплёатарамі і царскім прыгнётам, у абароне інтарэсаў пралетарыяту.

Тав. Красоўскі стойка і самаддана працаваў усё сваё жыцьцё на справу пралетарыяту. Цяжкая хвароба, не пакінула тав. Красоўскага для інтарэсаў партыі і непасрэднай работы. Ён увесь час думаў аб адзінстве радоў партыі, стойка вядучы барацьбу з усякімі хістаньнямі і амаль да самага канца свайго жыцьця быў зьвязан з непасрэднай работай.

Таварышы, якія ведалі тав. Красоўскага, будуць помніць яго, як стойкага, адданага справе рэвалюцыі, барацьбіта-бальшавіка.

Памяць аб табе, дарагі тав. Ігнат доўга будзе жыць у нас, як аб добрым таварышы, стойкім змагары і вытрыманым бальшавіку.

А. Бэйлін, Васілевіч, Калнін, Рыжоў, Славінскі, Сасноўскі.

Вылазка царкоўнікаў

Канфэрэнцыя бязбожнікаў патрабуе паказальнага суду над хуліганамі

1-га чэрвеня, а 11 з палов. гадз. ночы дэлегатка Менскай акруговай канфэрэнцыі саюзу Бязбожнікаў т. Матулава варочалася дамоў з канфэрэнцыі. Каля свайго дому (прывакзальны раён) тав. Матулаву раптам акружыла група хуліганаў і пачала зьбіваць і кідаць у яе каменьнямі. На чале хуліганаў сталі сыны членаў царкоўнага савету чыгуначнай царквы, якія даўно ўжо пагражалі Матулавай за яе актыўную антырэлігійную работу. Некалькі хуліганаў былі апранутыя ў жаночую вопратку, баючыся, відавочна, каб іх не пазналі.

Ледзь т. Матулавай удалося выратавацца ад хуліганаў, якія пагражалі яе забіць.

Тав. Матулава—актыўная грамадзкая работніца, вядзе бязьлітасную барацьбу з рэлігіяй і царкоўнікамі. За гэта хуліганы і парашылі з ёю расправіцца.

Акруговая канфэрэнцыя бязбожнікаў, даведаўшыся аб гэтым, ухваліла рэзалюцыю, у якой адзначае, што гэты выпадак—ёсьць вылазка клясавага ворага, які ўсімі мерамі імкнецца падарваць антырэлігійную работу.

Канфэрэнцыя патрабуе, каб над хуліганамі быў наладжаны паказальны суд у клюбе Ільліча (чыгуначнікаў).

Па справе вядзецца тэрміновае расьследваньне.

— Сёньня, 5 чэрвеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні АПА Менакругкому склікаецца 1-е пасяджэньне пленуму Менакрсавету саюзу бязбожнікаў, яўка ўсіх таварышоў, якія абраны ў склад Менакрсавету СБ, абавязкова, без спазьненьня.

Шыманскі—Менакрана, Табайнік—ЦСПСБ, Вішнеўская—жанаддзел АК КП(б)Б, Разенгаўз—Дзяржбанк, Кватюўскі—6-ая польшкола, Багдановіч і Пракоф'еў—БДУ, Клімаў—Цэнтральны Дом Селяніна, Дазорцава—9-я школа, Конаджук—5-я школа, Даўгаполаў—Белпэдтэхнікум, Нікіцін—саюз нархарч, Яшкевіч—Эльвод, Землякоў—чыгунка, Закаменны—саюз будаўнікоў, Маслоўскі—АК ЛКСМ, Цыгалка—шклозавод «Пралетарыя», Грынбэрг—прац. сувязі, Папоў—каўполк, Малажаеў—артполк, Марголін—завод «Камунар», Таўсталес-Шыёнак—БДУ, Калінічэнка—дасьледч. школа, Матулава—чыгунка, Лапацін—полк ДПУ, Перапечын—1-ая школа сямехгодка, Турэцкі—арцель саматужнікаў, Ручкін—завод дрэваапрац., Калага—Ц. склад ЦРК, Жыхараў—лямцовачная ф-ка, Шварц—ЦП працасьветы і такаама запрашаецца раўкамісія т. т. Углін—саюз нархарч, Гурвіч—НКФ, Таль—полк ДПУ, Леваноліч—НКЗ, і Забаўскі—чыгунка.

Заг. АПА Менакругкому КП(б)Б ЦЭНЦЫПЕР.

Камісія па чыстцы апарату Менскага акруговага статыстычнага бюро паведамляе: што праверка і чыстка пачнецца з 10 чэрвеня г. г. Камісія звароцваецца да ўсіх працоўных і арганізацый паведаміць Менскай акруговай Рабоча-Селянскай Інспэкцыі (вул. Энгельса) аб усіх недахопах і адмоўных бакох працы апарату акрстатбюро, а таксама кампрамэтуючых матар'ялах на паасобных працаўнікоў. Усе матар'ялы будуць выкарыстаны ў часе праверкі і чысткі.

Старшыня камісіі па чыстцы Мен. акр. статбюро тав. А. Корф па справах чысткі асабіста прымае штодзённа ад 12 да 15 гадзін у памяшканьні ЦВК БССР, пляц Волі, 17, пакой 25, тэл. 8—55.

Ад беларускага таварыства прыхільнікаў выяўленчага мастацтва

У той час, як іншыя галіны мастацтва—літаратура, тэатр, музыка—штогод усё буйней разьвіваюцца і зрабіліся неадымнай часткай культурнага жыцьця шырокіх працоўных мас БССР, выяўленчае мастацтва разьвіваецца надта павольным тэмпам.

Дагэтуль выяўленчае мастацтва нязвычайна мала папулярызавана ў масах. Толькі час ад часу, калі адчыняліся ўсебеларускія мастацкія выстаўкі, беларускае выяўленчае мастацтва дэманстравала перад шырокім грамадзтвам свае дасягненьні і спыняла на сабе грамадзкую ўвагу. У перыяд паміж выстаўкамі ўсе забывалі пра выяўленчае мастацтва і пра тыя шляхі, якімі павінна ісьці творчая праца беларускіх мастацкіх сіл.

Беларускае выяўленчае мастацтва толькі тады здолее нармальна разьвівацца, калі яно будзе набліжана да мас і калі будзе створана вакол мастацкай дзейнасьці прыхільнасьць грамадзкай думкі. Трэба паказаць кожнаму рабочаму і селяніну, што мастацтва—гэта не забава, але адзін з магутных культурных сродкаў, які пры належным яго скарыстаньні, актыўна дапамагае сацыялістычнаму будаўніцтву.

Выходзячы з гэтых меркаваньняў Беларускае т-ва прыхільнікаў выяўленчага мастацтва ставіць сваёй мэтай:

1. папулярызаваць выяўленчае мастацтва сярод шырокіх працоўных мас;
2. вывучаць усе формы выяўленчага мастацтва і арганізаваць крытычную марксыцкую думку вакол пытаньняў выяўленчага мастацтва;
3. дапамагаць у вырашэньні сучасных мастацкіх праблем;
4. імкнуцца да ўтварэньня лепшых умоў для творчай працы мастакоў.

Выяўленчае мастацтва ў савецкай краіне павінна быць адной з форм клясавай пралетарскай зброі. Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі працоўныя масы павінны скарыстаць гэту зброю ў барацьбе за новы быт, за новую сацыялістычную культуру, новую сацыялістычную гаспадарку.

Па даручэньні заснаваўчага сходу прэзыдыум т-ва.

Кнігі, надасланыя ў рэдакцыю для рэцэнзіі

Рэдакцыя атрымала для рэцэнзіі наступныя кнігі:

1. Д-р Цьвіневіч, Ів.—«АНАТОМІЯ, ФІЗЫОЛЁГІЯ, ГІГІЕНА». Выданьне другое.
2. Сяргей Дарожны—«ВАСІЛЬКОВЫ РОССЫП» (вершы).
3. Чарот, М.—«ЗАВІРУХА» (вершы).
4. Язэп Пушча—«ПЕСЬНІ НА РУІНАХ» (вершы).
5. Праф. І. Арамаў—«АСНОВЫ ПЭДОЛЁГІІ».
6. Лайкоў, М.—«НАРЫС ПА ГРАМАДЗКАЙ АГРАНАМІІ БЕЛАРУСІ».
7. „Дэталізаваная праграма фізыкі для пэдтэхнікуму дома".
8. Лайкоў, М.—«ЯКІЯ ШМАТПОЛЬНЫЯ СЕВАЗВАРОТЫ РАЦЬ ЧАСОПІСЬ «ПЛУГ» ДЛЯ СЯЛЯН БЕЛАРУСІ».
9. Сярпінскі, С.—«ШТО ТАКОЕ КІНО».
10. Даніэль, М.—„ЛЕЙБКА Берлінчык".
11. «НАША СІЛА—САВЕТЫ»—дэкламатар для дарослых.
12. „Полымя", ва красавік м-ц 1929 г.
13. П. Панкевіч—«ГІСТОРЫЯ ПЭДАГОГІКІ». БДВ. Ц. 3 р. 75 к.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні АК МОПР'у адбудзецца пасяджэньне Фрунзаўскага райкому МОПР'у.

Парадак дня: 1. Аб канферэнцыі. 2. Аб кампаніі пратэсту супроць падзей у Нямеччыне. 3. Бягучыя справы.

Яўка ўсіх членаў прэзыдыуму абавязкова. Запрашаюцца актывісты МОПР'у.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня апошні дзень прыёму дзяцей на пляцоўку. Бібліятэка з 1/VI адчынена будзе толькі па сэрадах, пятніцах і нядзелях ад 4 да 8 г. ув., а з 1 ліпеня па 1 жніўня будзе зусім зачынена. Просьба да чытатоў зьвярнуць узятыя кнігі. Адчынена запісь у тэніёную, гарадкоў і баскетбольную групы.

— У сераду 5/VI у Доме Асьветы роўна в 6-ай гадзіне адбудзецца зачынены сход ячэек КП(б)Б Працасьветы і Наркамасьветы.

Яўка абавязкова без спазьненьня.

— КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ. У сераду 5/VI, а 8-й гадз. увечары ў клюбе Навуков. Працаўнікоў оклікаецца агульны сход членаў Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў гор. Менску разам з членамі II-га Пленуму Цэнтр. Савету.

ПАРАДАК ДНЯ—Гутарка т. ЗАТОНСКАГА на тэму: «Нацпытаньне ў БССР і сацыялістычнае будаўніцтва».

Просьба да членаў Сэкцыі зьявіцца на сход сваечасова».

— Ц. Праўленьне Саюзу Саўгандальслужачых паведамляе, што у чацьвер—6 чэрвеня г.г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу нашага саюзу склікаецца нарада ўсяго прафактыбу н/саюзу г. Менску. У парадку дню: прапрацоўка тэзісаў да VIII усесаюзнага зьезду н/саюзу.

Яўка ўсяго складу МК і прафактыбу абавязкова без спазьненьня.

Да ведама арганізацый МОПР'у БССР

Цэнтральны камітэт МОПР'у БССР просіць усе арганізацыі МОПР'у і іншыя грамадзкія арганізацыі перавод зіць грошы, зьбіраемыя ў карысьць ахвяр сацыял-фашызму па назначэньні ў адпаведныя райкомы і акругкомы МОПР'у безадкладна па іх паступленьні.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Серада, 5 чэрвеня.) — (Для ЛКСМ

ІНГА

Сучасная п'еса ў 4 дзеях, 12 абразох.
Пачатак а 8 гадз. увечары

Летні тэатр «ПРАФІНТЭРН»

Гастролі Ленінградзкага Рэалістычнага тэатру

Серада, 5 чэрвеня. **„СИГНАЛ"**

п'еса ў 3-х дзеях, 20 эпізодах.
Пачатак а 9 гадз. увечары.
Білеты ў рабочай касе, а ў дзень спектаклю ў касе летняга тэатру „Прафінтэрн".

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Новы мастацкі баявік **ЛЯСНЫ ЧАЛАВЕК** Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Новы мастацкі фільм, вытв. Белдзяржкіно **400 мільёнаў** Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Бытавы фільм **За чужыя грахі** Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз. увеч.

КІНО Пралетары — Мастацка-гістарычны ф